Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 СНЕЖНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 250 (28108) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## 2016-ты аб'яўлены Годам культуры

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 28 снежня падпісаў Указ №522 «Аб аб'яўленні 2016 Годам культуры».**

Указ прыняты з мэтамі аб'яднання інтэлектуальных і духоўных сіл грамадства для вырашэння задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, захавання гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця народных традыцый, выхавання ў грамадзян любові да Айчыны, а таксама падтрымкі творчых ініцыятыў.

Ураду даручана сумесна з аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам распрацаваць і зацвердзіць рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2016 годзе Года культуры, які закранае ўсе сферы дзейнасці (культура вытворчасці і земляробства, культура сямейных адносін і побыту, культура ўладкавання населеных пунктаў).

Значная ўвага будзе нададзена мерапрыемствам у сферы мастацкай культуры, якая з'яўляецца адным з асноўных сродкаў выхавання ў моладзі патрыятызму і павагі да Радзімы.

Таксама прадугледжваецца комплекс мерапрыемстваў, звязаны са знакавымі для культуры Беларусі юбілейнымі датамі.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

*«На праблемным прадпрыемстве трэба стварань спрыяльныя ўмовы для прыходу інвестара. Хачу звярнуць увагу, што ў беларускіх прадпрыемстваў ёсць магчымасць скарыстацца рашэннямі кіраўнікоў дзяржаў па льготных кітайскіх крэдытах і кітайскіх інвестыцыях. Калі ёсць магчымасць прыцягнуць інвестара, трэба стварань умовы для таго, каб гэты інвестар адбыўся».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18370,00 | ▲ |
| Еўра | 20136,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 259,74 | ▼ |
| Укр. грыўня | 771,85 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НАСТРОЙ — СВЯТОЧНЫ І ЎЗНЁСЛЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінчанка Таццяна Куляшова з паўтарагадовай дачкой Юліяй і матуляй Вольгай наведалі праваслаўны Калядны кірмаш, што распачаў работу ў Мінску, і радуюцца першаму снегу.

■ З першых вуснаў

# ЭВАЛЮЦЫЯ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ ПРАЦЯГНЕЦЦА

**Праблематыка аховы здароўя, адукацыі, сацпадтрымкі, пенсійнага забеспячэння пастаянна знаходзіцца ў зоне павышанай грамадскай увагі, паколькі гэта сфера інтарэсаў кожнага чалавека незалежна ад яго статусу і ўзросту. У інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА выказала сваю думку па пытаннях, якія найбольш хвалююць жыхароў Беларусі, — аб павышэнні пенсійнага ўзросту і абмежаваннях для працуючых пенсіянераў, мерах падтрымкі сем'яў з дзецьмі, працягласці летніх канікул, змене правіл прыёму ў ВНУ, плаце за наведванне паліклінік, барацьбе з п'янствам, падатку на багатых, кошце беларускіх віз і інш.**

***— Наталля Іванаўна, законапраект аб рэспубліканскім бюджэце на 2016 год ужо паступіў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Бюджэт па-ранейшаму будзе сацыяльна арыентаваным. На вашу думку, ці захаваецца сацыяльная арыентацыя ў наступныя гады і якія сацыяльныя сферы ў будучыні запатрабуюць вылучэння больш важкіх асігнаванняў?***

— Дзяржава не зменіць сацыяльныя арыенціры: клопат пра чалавека быў і застаецца лейтматывам усёй дзяржаўнай палітыкі. Гэта пацвярджае і рэспубліканскі бюджэт на 2016 год. На адукацыю выдзяляецца 4,85% ВУП (на 2015 год — 4,82%), на ахову здароўя — 4,28% (у 2015-м — 3,99%), а з улікам пазабюджэтнай дзейнасці гэтыя лічбы будуць яшчэ вышэйшымі.



Фота БЕЛТА.

Я думаю, што ў наступныя гады дынаміка захаваецца, на сацыяльную сферу будуць і надалей вылучацца сур'ёзныя фінансавыя рэсурсы.

Хачу падкрэсліць: нягледзячы на складаныя эканамічныя ўмовы, ні адна сацыяльная праграма не закрыта. Пры гэтым іх колькасць скарочана за кошт акумуляцыі ўзаемазвязаных кірункаў. Такі праграмна-мэтавы падыход дазволіць сканцэнтраваць рэсурсы на вырашэнні найважнейшых праблем.

Напрыклад, у бягучым годзе завяршаецца рэалізацыя другой Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі. Паколькі пытанні дэмаграфіі па-ранейшаму вельмі важныя для нашай дзяржавы, распрацавана новая дзяржпраграма «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» на 2016-2020 гады. Яна ўключае 7 падпраграм: «Сям'я і дзяцінства», «Прафілактыка і кантроль неінфекцыйных захворванняў», «Папярэджанне і пераадоленне п'янства і алкагалізму», «Сухоты», «Прафілактыка ВІЧ-інфекцыі», «Забеспячэнне функцыянавання сістэмы аховы здароўя», «Знешняя міграцыя».

На рэалізацыю праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» ў наступным пяцігоддзі мяркуецца накіраваць больш за Br265 трлн ($14,5 млрд у эквіваленце). Аб'ём фінансавання павялічаны больш чым у 15 разоў у параўнанні з папярэдняй праграмай дэмбяспекі (з улікам аб'яднання дзяржпраграм, якія рэалізоўваліся паасобку).

***— Дзяржавай у апошнія гады прынятыя сур'ёзныя захады па падтрымцы сем'яў з дзецьмі, стымуляванні нараджальнасці, умацаванні здароўя насельніцтва. Атрымалася знізіць тэмпы дэпапуляцыі, значна палепшыліся і іншыя дэмаграфічныя паказчыкі. Куды будзе накіраваны вектар сямейнай палітыкі ў наступным пяцігоддзі?***

— Галоўныя прыярытэты дзяржаўнай сямейнай палітыкі — паўнацэнная сям'я з дзецьмі, устойлівыя шлюбы, здаровае гарманічнае жыццё. Гэта аснова асноў, падмурак будучага дабрабыту чалавека, грамадства, краіны. Таму наша агульная задача — прапаганда традыцыйных сямейных каштоўнасцей і здаровага ладу жыцця. І пачынаць яе трэба з дзіцячых гадоў у сям'і, якая павінна быць прыкладам для пераймання, са школьнай лавы.

У Беларусі трэба ўкараняць нацыянальную мадэль планавання сям'і — матываваць моладзь на нараджэнне двух і больш дзяцей. Дарэчы, з кожным годам узрастае колькасць сем'яў, якія маюць двух і больш дзяцей. Пры гэтым памяншаецца доля пазашлюбных нараджэнняў (з 25% да 15%). Гэта не можа не радаваць.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА!

Завяршаецца падпіска на «Звязду» на I квартал 2016 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## СКЛАДНІКІ ДАБРАБЫТУ

**Прэзідэнт па традыцыі напярэдадні Новага года ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды найлепшым працаўнікам**

**Падчас цырымоніі Аляксандр Лукашэнка даў высокую ацэнку дасягненням калектываў, якія ў нялёгкіх эканамічных умовах здолелі не толькі выстаяць, але і выйсці на больш высокія рубяжы ў сваёй прафесійнай дзейнасці.**

«Дабрабыт Беларусі складваецца, вядома ж, з поспехаў канкрэтных людзей: рабочых, служачых, кіраўнікоў. Тых, хто не апускае рукі, не адступае перад праблемамі, а шукае шляхі іх вырашэння», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адрасаваў словы падзякі аграрыям, якія, нягледзячы на працяглую засуху, здолелі забяспечыць харчовую бяспеку народа, будаўнікам, якія прымалі ўдзел у рэалізацыі шэрага праектаў прамысловага і сацыяльнага прызначэння. На цырымоніі ўручэння дзяржузнагарод прысутнічала і вялікая група медыцынскіх работнікаў, якія ўнеслі важкі ўклад у развіццё айчыннай аховы здароўя. Узнагарод таксама былі ўдастоены ваеннаслужачыя. «У тым, што на нашай зямлі сэнта захоўваюцца мір, законнасць і грамадская згода, вялікая заслуга прадстаўнікоў слаўных структур», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Звяртаючыся да ўсіх удзельнікаў цырымоніі, сярод якіх былі таксама педагогі, дзеячы культуры, спорту, кіраўнік дзяржавы пажадаў, каб узнагароды сталі для іх чарговай вяхой на шляху да новых здзяйсненняў. «Вашы дасягненні дапамагаюць нам з надзеяй глядзець у будучыню. Бо вы на ўласным прыкладзе даказалі, што цярпенне, праца, вернасць свайму прызванню мацнейшыя за любыя абставіны», — сказаў Прэзідэнт.

## СУД І СПРАВА

**Перспектывы ўдасканалення судаводства былі разгледжаны на сустрэчы кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй Вярхоўнага суда Валянцінам Сукалам.**

Валянцін Сукала праінфармаваў кіраўніка дзяржавы, што аб'яднанне агульных і эканамічных судоў дало станоўчы эфект. Прэзідэнту таксама была прадстаўлена праграма развіцця судовай сістэмы на будучую пяцігодку. Запланаваныя пераўтварэнні паскораць і спросцяць судовыя працэсы, зробяць іх больш эканамічнымі. Чакаецца таксама, што працэс правасуддзя стане яшчэ больш адкрытым і зразумелым для радавых грамадзян і суб'ектаў гаспадарання.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што магчыма пэўная карэкціроўка крымінальнага заканадаўства і крымінальнай судовай практыкі ў плане іх большай гуманізацыі ў дачыненні да некаторых відаў правапарушэнняў, асабліва эканамічных. Прэзідэнт таксама спыніўся на парадку разгляду спраў аб банкруцтве прадпрыемстваў. На думку Аляксандра Лукашэнкі, яны павінны праходзіць праз дасудовае аздараўленне, мясцовым уладам і кіраўніцтву прадпрыемстваў трэба знаходзіць для гэтага ўсе магчымасці. Судовая стадыя павінна прымяняцца ў выключных выпадках, калі ўсе магчымасці дасудовага аздараўлення вычарпаны. У час сустрэчы адзначалася, што ў краіне можна спыніць значную колькасць дробных крымінальных спраў на дасудовай стадыі, не прымяняць шырока канфіскацыю маёмасці, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Па выніках абмеркавання Аляксандр Лукашэнка ўвогуле ўхваліў прапанаваную праграму.

## УЗМАЦНІЦЬ БАРАЦЬБУ З ХУЛІГАНСТВАМ

**Такую задачу паставіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка перад міністрам унутраных спраў Ігарам Шуневічам.**

Кіраўнік дзяржавы занепакоены ростам злачынстваў хуліганскай накіраванасці і тым, што вінаватых часам не знаходзяць. Гэта, паводле яго слоў, «маральна цісне нашых людзей, а мы іх павінны абараніць». Прэзідэнт запатрабаваў ад міліцыі жорстка ставіць на месца хуліганаў — да следчых дзеянняў і судовых разглядаў, паведамляе БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка пазітыўна ацаніў практыку патрулявання вуліц у гарадах. Паводле слоў Прэзідэнта, важна, каб грамадзяне ў Беларусі, асабліва людзі сталага ўзросту, адчувалі сябе абароненымі.

Як далажыў кіраўніку дзяржавы Ігар Шуневіч, сітуацыя са злачыннасцю ў краіне знаходзіцца пад кантролем. Міністр праінфармаваў Прэзідэнта аб выніках працы МУС у адыходзячым годзе, асноўных паказчыках, якія характарызуюць крымінагенную абстаноўку ў краіне, і мерах, што прадпрымае міністэрства, каб паўплываць на гэтыя паказчыкі.

## ДЛЯ ПАДТРЫМКІ ТАЛЕНТАЎ

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сваім распараджэннем зацвердзіў рашэнні савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.**

У прыватнасці, зацверджаны рашэнні савета фонду аб заахвочванні 1581 навучэнца і педагагічнага работніка. Стыпендыі фонду на першы семестр 2015/2016 навучальнага года прызначаны 182 студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі. Грашовай прэміяй з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду заахвочаны 30 пераможцаў розных міжнародных алімпіяд. Таксама грашовымі прэміямі заахвочаны пераможцы заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, конкурсаў навукова-тэхнічнай творчасці, навуковых прац, злётаў вынаходнікаў і рацыяналізатараў, студэнцкай алімпіяды па матэматыцы.

Заахвочвальнымі прэміямі адзначаны 252 педагагічныя, навуковыя работнікі і іншыя асобы, якія ўнеслі асаблівы ўклад у развіццё адораных навучэнцаў і студэнтаў па выніках 2014/2015 навучальнага года. Акрамя таго, аказана фінансавая падтрымка васьмі навукова-даследчых і творчых аб'яднанням навучэнцаў і студэнтаў.

■ Нашы дзеці

# «КРАІНЕ ВЫ ПАТРЭБНЫ!»

**Перадпнавагодняя дні па добрай традыцыі праходзяць пад знакам увагі да дзяцей. Добрымі словамі, пажаданнямі, падарункамі не абдзелены ні адзін маленькі грамадзянін нашай краіны. Апошнія выхадныя 2015-га сталі сапраўдным святам для соцень дзяцей. У мерапрыемствах, прысвечаных юным жыхарам Беларусі, прыняў удзел і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

На навагоднее дабрачыннае свята акцыі «Нашы дзеці» ў Палацы Рэспублікі з удзелам кіраўніка дзяржавы з'ехаліся 2 тысячы 370 дзяцей ва ўзросце 8-14 гадоў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Сярод удзельнікаў былі дзеці-сіроты, дзеці са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, выхаванцы кадэцкіх вучылішчаў. На навагоднее свята прыехалі таксама дзеці з раёнаў, найбольш пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, дзеці-бежанцы, школьнікі, узнагароджаныя па выніках раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, конкурсаў, спаборніцтваў, навучэнцы, якія маюць поспехі ў грамадскай рабоце. Акрамя таго, у Палац Рэспублікі прыехалі навучэнцы Вільнюскай гімназіі Францыска Скарыны, Рыжскай беларускай асноўнай школы.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў юным беларусам вырасці па-сапраўднаму адукаванымі людзьмі і прымножыць нацыянальныя багацці. «Мы зробім усё для таго, каб ваш талент, розум, вашы здольнасці не зніклі, не прапалі дарма. Мы зробім усё для таго, каб вы ў сваёй краіне адчувалі сябе патрэбнымі. Гэта самае галоўнае», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яму, як Прэзідэнту, вельмі хочацца, каб юныя беларусы з упэўненасцю глядзелі ў будучыню, разлічвалі на свае сілы і любілі Беларусь. А стаўшы дарослымі, прадоўжылі добрыя традыцыі і ўнеслі свой уклад у працвітанне Айчыны, заўсёды захоўвалі мір і згоду на роднай зямлі.

«У юных беларусах увасабляюцца самыя светлыя мары і надзеі не толькі іх бацькоў, але і ўсёй краіны», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Цудоўна, што ў нас у Беларусі нараджаецца ўсё больш і больш дзяцей. Значыць, мы можам верыць, што нашу Радзіму чакае шчаслівае заўтра», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка, які з'яўляецца Прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта, прысутнічаў таксама на заключным этапе Каляднага дзіцячага лёгкаатлетычнага свята «300 талентаў для Каралевы». Гэтае свята праводзілася ў краіне ўпершыню, і яно заклікана дапамагчы ў адборы найбольш перспектыўных дзяцей для заняткаў лёгкай атлетыкай. Вітаючы юных удзельнікаў святочных спаборніцтваў, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Мне вельмі прыемна, што не на хакей, а на лёгкаатлетычнае мерапрыемства ў гэты зімовы час мы сабраліся, каб на свяце спорту сустрэць Новы год».

«Упэўнены, што сярод вас ёсць будучыя чэмпіёны, якія пацвердзяць на сусветных арэнах імідж нашай краіны як спартыўнай дзяржавы. Мы вельмі спадзяёмся, што вы станеце прадаўжальнікамі слаўных традыцый сваёй краіны», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да ўдзельнікаў спаборніцтваў.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі для фізічнага развіцця створаны ўсе неабходныя ўмовы — спартыўныя пляцоўкі, залы, стадыёны, дзе можна займацца любым відам спорту. Усё гэта зроблена для таго, каб дзеці раслі ў першую чаргу фізічна моцнымі і здаровымі.

Прэзідэнту спадабалася ідэя правядзення такога мерапрыемства, ініцыятарам якога стаў старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім Дзевятоўскі. «Я вельмі спадзяюся, што і іншыя спартыўныя федэрацыі возьмуць прыклад з федэрацыі лёгкай атлетыкі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён выказаў надзею, што «гэта — не фармальнае мерапрыемства, а тое, якое дасць магчымасць выявіць парасткі на першапачатковым этапе і давесці іх да ўзроўню сусветных рэкардсменаў».

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў трэнерам і бацькам юных спартсменаў, якія сабраліся на свята з усіх рэгіёнаў краіны. «Толькі дзякуючы вам мы зможам з іх, пры вашым жаданні, найперш, зрабіць сапраўдных спартсменаў, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І тыя бацькі, якія рызыкнуць падарыць нам будучых вялікіх спартсменаў, — проста героі. Я ведаю, што такое пусціць дзіця ў гэтае доўгае, вельмі складанае спартыўнае плаванне. Таму вы проста героі, на якіх павінны раўняцца ўсе мы».

Прэзідэнт паназіраў за ходам усіх спартыўных эстафет, пабалеў за юных спартсменаў, асноўная частка якіх, дарэчы, з вёсак і невялікіх гарадкоў, а таксама цёпла і шчыра паразмаўляў з хлопчыкамі і дзяўчынкамі.

# Падарыць цеплыню і клопат

**У рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» кіраўнікі рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады наведалі дзіцячыя ўстановы, каб павіншаваць малых са святамі.**

У сталічным дзіцячым доме №7 «Сем Я» пабывалі **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ. Віцэ-прэм'ер Анатоль КАЛІНІН** перадаў падарункі — цукеркі, тэлевізары і адукацыйныя гульні — у Мінскі дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. «Кожнае дзіця павінна атрымаць не толькі матэрыяльны падарунак, але і ўвагу, клопат і павагу, — адзначыў віцэ-прэм'ер. — Упэўнены, што самы галоўны падарунак, які просіць гэтая малеча, — здароўе. Думаю, у цэнтры робіцца ўсё, каб выканаць такую мару».

Рудзенскую дапаможную школу-інтэрнат наведала **намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА.** «Дзеці ў гэтае навагоднее свята мусяць атрымаць падарунак і, несумненна, цеплыню нашых душ і сэрцаў, — заўважыла яна. — Інтэрнатныя ўстановы павінны захоўвацца, але ў той жа час хацелася б, каб усе малыя, у тым ліку і з асаблівасцямі развіцця, выхоўваліся ў сем'ях».

На навагоднім гарадскім свяце ў Беларускім дзяржаўным цырку юнакоў віншаваў **мэр сталіцы Андрэй ШОРАЦ.** На спектакль запрасілі больш за 1,5 тысячы дзяцей: пераможцаў алімпіяд, спартыўных спаборніцтваў і творчых конкурсаў, сірот, малых са шматдзетных сем'яў, дзяцей-інвалідаў.

**Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Станіслаў ЗАСЬ** наведаў Радашковіцкую школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Ён павіншаваў выхаванцаў з надыходзячымі святамі і ўручыў ім салодкія падарункі. Акрамя таго, у якасці навагодняга падарунка супрацоўнікі Дзяржсакратарыята за кошт сабраных сродкаў дапамаглі інтэрнату тэхнічна абсталяваць лінгвістычны кабінет.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# ЖАР-ПТУШКА ДЛЯ МАЛЕЧЫ

## Кіраўніцтва аб'яднання «Белая Русь» купіла... балет

**Артысты Вялікага тэатра оперы і балета ў рамках акцыі «Нашы дзеці» падарылі дзеткам яскравую казку «Жар-птушка». Юныя гледачы — дзеці членаў рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» і падапечныя арганізацыі з усёй рэспублікі, якія ўжо чацвёрты год запар у перадсвяточныя дні атрымліваюць такі сюрпрыз.**



У Мінск на спектакль з усіх рэгіёнаў з'язджаюцца як малыя, якім імпрэзу «зарабілі» сваёй актыўнай дзейнасцю бацькі-члены «Белай Русі», так і дзеці-інваліды, дзеці са шматдзетных сем'яў і іншыя, якія апякае аб'яднанне. Акрамя галоўнага відовішча, у кожным рэгіёне члены таварыства праводзяць свае святочныя ёлкі.

*— Мы не вядзём улік нашых падапечных. Думаю, колькасць дзетак, якім мы дапамагаем, вымяраецца дзясяткамі, але мы стараемся апекаваць менавіта тых, хто мае ў гэтым найбольшую патрэбу,* — распавёў **Аляксандр ШАЦЬКО, намеснік старшыні «Белай Русі».** — *Стараемся адшукваць тых, каму гэта неабходна ў першую чаргу, тых, хто з нейкіх прычын выпадае з-пад увагі іншых структур. Спрабуем працаваць апературна, каб падставіць плячо тым, каму гэта неабходна менавіта зараз.*

Да балета дзеці фатаграфаваліся з Дзедам Марозам і Снягуркай, захапляліся святочным убраннем тэатра і вадзілі карагоды вакол ёлкі, а пасля казкі атрымалі салодкія падарункі.

Самы святочны настрой быў, пэўна, у малых з Бабруйска. Кожны з іх расказваў вершык і атрымліваў ласункі непасрэдна ад Дзеда Мароза са Снягуркай. Пра гэта паклапацілася мясцовае кіраўніцтва «Белай Русі», якое надае вялікую ўвагу перадпавагоднім мерапрыемствам.

**Мікалай ТРАФІМОВІЧ, старшыня «Белай Русі» «Белшыны»** гаворыць:

*— Штогод, збіраючыся ў Мінск на спектакль, мы загадзя запрашаем Дзеда Мароза, каб дзеці да канца адчулі, якое гэта дзівоснае свята. 50 малых — гэта дзеці нашых актывістаў, дзеці з абмежаванымі магчымасцямі, са шматдзетных сем'яў, дзеці, якія выхоўваюць маці-адзіночкі.*

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара** ■

# ГАРАЧЫ ЛЁД У ЧЫЖОЎЦЫ

**Хакейная каманда Прэзідэнта абыграла гродзенцаў**

**Матч калектываў, якія ў мінулым годзе сталі залатымі і бронзавымі прызёрамі Рэспубліканскіх спаборніцтваў па хакеі з шайбай сярод аматарскіх каманд на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, сёлета быў па-сапраўднаму гарачым. Гульня на пляцоўцы малой арэны ў Чыжоўцы атрымалася вельмі ўпартай і напружанай з першых да апошніх хвілін.**


Фота БЕЛТА.

Хакеісты каманды Прэзідэнта краіны толькі напрыканцы першага перыяду змаглі адкрыць лік у матчы, дакладны кідок на рахунку Яўгена Курыліна. У другія дваццаць хвілін сустрэчы заўзятары закінутых шайбаў не ўбачылі, а ў трэцім перыядзе выніковым кідком адзначыўся Андрэй Глебаў — 2:0. Гэты лік і аказаўся канчатковым, хоць госці да канца сустрэчы спрабавалі адыграцца і на апошніх хвілінах паядынку нават замянілі варатара на шостага палявога гульца.

Найлепшымі ў матчы сталі галкіпер Ян Шаляпнёў з лядовай дружыны Гродзенскай вобласці і абаронца Андрэй Глебаў у складзе каманды Прэзідэнта.

Нагадаем, матчы першага этапу IX Рэспубліканскіх спаборніцтваў аматараў хакея на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба праходзяць з лістапада па сакавік. Пасля чатырох гульняў у турніры на рахунку хакейнай каманды Прэзідэнта Беларусі 8 ачкоў, яна і ўзначальвае табліцу спаборніцтваў. Пасля заканчэння аднакругавога турніру чацвёрка найлепшых каманд падчас другога этапу разыграе медалі і галоўны прыз спаборніцтваў.

Адзначым таксама, што каманда Прэзідэнта Беларусі 6 разоў станавілася пераможцай (2008, 2010—2015). У 2009 годзе турнір выйграла дружына Гомельскай вобласці, а ў 2013-м найлепшымі былі хакеісты Мінскай вобласці.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ДЗЯТВЕ СПАТРЭБІЛІСЯ САНКІ

**Мы ўбачылі сур'ёзны снег, а ў навагоднюю ноч абяцаюць і мароз да мінус 18 градусаў**

**На гэтым тыдні да нас сапраўды завітала зіма з невялікім снегам і маразамі, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Паводле слоў спецыяліста, цяпер зіма наганяе страчанае: няхай пакуль без моцных снегападаў, але з добрымі маразамі. Гэтымі днямі на поўначы кантынента набірае сілу скандынаўскі антыцыклон. Таму сёння месцамі пройдзе невялікі снег, на дарогах прагназуецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 1—7 марозу. Не чакаецца істотных ападкаў і ў сераду. На некаторых участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 7 да мінус 14 градусаў, месцамі чакаецца нават 15—17 марозу. Удзень будзе мінус 2—8 градусаў.

У апошні дзень года таксама без істотных ападкаў, але на дарогах месцамі захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на чацвер будзе мінус 9—15 градусаў, месцамі — да мінус 16—18 градусаў. Удзень — даволі камфортныя для зімы 4—10 марозу.

У навагоднюю ноч будзе марозна і невялікі снег, які на фоне павышанага ціску адзначыцца ў асобных раёнах. На дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 9 да мінус 15 градусаў, а месцамі чакаецца да 16—18 марозу. У першы дзень новага года чакаецца мінус 5—10 градусаў, у некаторых раёнах будзе нават да 12 марозу. У сталіцы на галоўнае свята года магчымы невялікі снег. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 11—13 градусаў, удзень — 7—9 марозу.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у першыя дні студзеня прагназуецца далейшае ўзмацненне маразоў. Так, у суботу і нядзелю месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 12—19 градусаў, а пры праясненнях — да 20—23 марозу. Даволі холадна на выхадных будзе і ўдзень, калі прагназуецца ад мінус 8 да мінус 15 градусаў, а месцамі чакаецца нават да 17 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ На слыху

# І БОНУС, І АДКАЗНАСЦЬ

**Недзяржаўныя ўстановы аховы здароўя атрымліваюць з 1 лютага 2016 года права выдаваць лісткі непрацаздольнасці. Наколькі яны да гэтага гатовы?**

**Такое рашэнне замацаванае ў двух адпаведных дакументах — Міністэрства аховы здароўя і ў сумесным гэтага ведамства і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Скарыстацца правам выдачы бальнічных, як іх называюць, можа каля 1 тысячы медустаноў прыватнай формы ўласнасці. На момант падрыхтоўкі матэрыялу ніводная з іх яшчэ не звярталася ў міністэрства для набыцця адпаведных бланкаў. Зноў жа трэба падкрэсліць, што размова ідзе аб праве, а не абавязку прадастаўляць сваім кліентам падобную паслугу.**

**Начальнік аддзела медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Ірына КІРЭЕВА тлумачыць іншыя падрабязнасці.**

## НЕ ТАК І СКЛАДАНА?

— Наколькі гатовы да такой практыкі прыватныя медцэнтры? Трэба пытацца ў іх. Але нічога звышскладанага тут не патрабуецца, размова ідзе аб практыцы, звычайнай для дзяржаўных устаноў аховы здароўя. Для ўкаранення дадатковай паслугі неабходна выканаць некалькі ўмоў.

**Адкрыць і закрыць бальнічны неабходна ў адной установе. Той, хто выдае бальнічны, павінен назіраць за станам здароўя пацыента.**

Па-першае, забяспечыць належнае захоўванне бланкаў бальнічных — гэта можа быць, напрыклад, памяшканне з сігналізацыяй. Але такое памяшканне або сейф ёсць у любой установе, што працуе з бланкамі строгай справаздачнасці. Па-другое, неабходна прызначыць матэрыяльна адказную асобу і арганізаваць урачэбна-кансультацыйную камісію. Ад старшыні такой камісіі патрабуецца прафесійная падрыхтоўка па экспертызе і наяўнасць першай катэгорыі. Можна меркаваць, што такія спецыялісты ў тых медцэнтрах, якія планавалі заняцца выдачай бальнічных, ужо ёсць. Па-трэцяе, спецыялісты, якія могуць выпісваць ліст непрацаздольнасці, таксама добра вядомы — гэта ўрачы, якія назіраюць пацыентаў. У сэнсе, не ўрач прыёмнага пакоя і не той, хто ажыццяўляе толькі кансультацыйны прыём.

## ЦІ ЁСЦЬ АБМЕЖАВАННІ?

— Лісткі непрацаздольнасці могуць выдавацца практычна ва ўсіх выпадках часовай непрацаздольнасці. Але ёсць важкія выключэнні, напрыклад пры неабходнасці лячэння па-за межамі краіны па накіраванні Міністэрства аховы здароўя, калі патрабуецца накіраванне ў Віцебскі абласны клінічны цэнтр медыцынскай рэабілітацыі для інвалідаў і ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, Рэспубліканскую бальніцу спелеалячэння, накіраванне дзяцей-інвалідаў на санаторна-курортнае лячэнне і рэабілітацыю і інш.

## ЯК БУДЗЕ НА ПРАКТЫЦЫ?

— Можна меркаваць, што практыка выдачы бальнічных лістоў камерцыйнай медустановай будзе зручнай найперш для тых, хто з'яўляецца пастаянным кліентам гэтай установы. Або для тых, хто жадае аплаціць сваё абследаванне і назіранне, каб толькі не стаяць у чэргах паліклінікі. Сама працэдура выдачы бальнічнага ў камерцыйнай установе не спрашчаецца. Гэта не азначае, што вы заплаціце і вам яго абавязкова дадуць. Урач павінен валодаць інфармацыяй аб перанесеных захворваннях, наяўнасці інваліднасці, мінулых выпадках часовай непрацаздольнасці і інш. Безумоўна, ніхто не забараняе прынесці адпаведныя выпіскі з паліклінікі, а наколькі гэта зручна для пацыента — яго справа. Акрамя таго, адкрыць і закрыць бальнічны неабходна ў адной установе. Той, хто выдае бальнічны, павінен назіраць за станам здароўя пацыента. Наогул жа, прыкметы непрацаздольнасці па кожным захворванні здольны выявіць любы ўрач.

Выдаваць ліст непрацаздольнасці будзе ўрач, а падпісваць — яшчэ і кіраўнік установы, або яго намеснік, або ўрачэбна-кансультацыйная камісія. Бальнічны можа быць выдадзены і дома, калі такая форма работы прадугледжана ў тым цэнтры, куды вы звярнуліся.

## ШТО ПАСПРЫЯЛА?

— Неабходнасць прыняцця адпаведных дакументаў па такім новаўвядзенні ініцыявалі самі прадпрымальнікі, прыватныя медцэнтры. У любым выпадку яны павінны ўлічваць не толькі бонусы ў выглядзе прытоку пацыентаў, але і адпаведную адказнасць. Міністэрства будзе ажыццяўляць кантроль такім жа чынам, як і ў дзяржустановах. Мы пастаянна праводзім маніторынг лістоў непрацаздольнасці, паколькі тут маюць месцы карупцыйныя рызыкі. Звычайна парушэнне заканадаўства ў гэтай частцы здараецца рэдка, цягам года фіксуецца адзінкавыя выпадкі. За гандаль бальнічнымі прыватныя цэнтры будуць пазбаўляцца ліцэнзіі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПАДАРУНКІ ДЗІЦЯЧАМУ САДКУ БЕЛАСТОКА

**Напярэдадні Новага года ў беларускі дзіцячы садок №14** Беластока з Мінска адправілася пасылка з дзіцячымі падарункамі. Іх сабралі выхаванцам садка Беларускі фонд культуры і таварыства «Беларусь — Польшча» Беларуская таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі.

Хлопчыкі і дзяўчаткі, якія наведваюць гэты садок і вывучаюць не толькі польскую мову, а і беларускую, спяваюць нашы песні, носяць традыцыйныя вышыванкі, атрымаюць камплекты паштовак пра беларускія помнікі гісторыі і культуры, дзіцячыя кніжкі на беларускай мове, у тым ліку з аўтографамі Аксаны Спрынчан, Уладзіміра Ліпскага, Анатоля Бутэвіча, Навума Гальпяровіча, Тацяны Сівец і іншых пісьменнікаў. Каля ста кніжак, сабраных з дапамогай часопіса «Вясёлка», выдавецтва «Мастацкая літаратура», Міністэрства інфармацыі і іншых дабрадзейных арганізацый, стануць добрымі дапаможнікамі не толькі ў вывучэнні беларускай мовы, а і засваенні беларускіх рэалій, арганізацыі вечароў, канцэртаў і іншых масавых мерапрыемстваў, якія з ахвотай ладзяць беларускамоўныя работнікі садка не толькі для сваіх выхаванцаў, а і для жыхароў Беластока. Акрамя таго, дзеткі атрымаюць беларускія цацкі і цукеркі.

**Анатоль БАЯРСКІ.**

## НА СВЯТЫ ТРАНСПАРТ ТАКСАМА «АДПАЧНЕ»

**У Мінску ў сувязі са змяненнем рэжыму працы шматлікіх прамысловых прадпрыемстваў горада ў перыяд навагодніх свят скарэкціравана праца грамадскага транспарту, пра што паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс».**

Так, 31 снежня будзе зменшана колькасць рухомага складу ў гадзіны пік на наступных маршрутах гарадскога пасажырскага транспарту: аўтобусных №№ 42, 61, 64, 88С, 97, 107, 127, 144С; тралейбусных №№ 26, 27, 32, 77; трамвайных №№ 3, 6. Адмяняецца выкананне абаротных рэйсаў: тралейбуснага маршрута №39 з ДС «Паўднёвы Захад» у 23.21; тралейбуснага маршрута №77 з ДС «Сухарава-5» у 23.19; аўтобуснага маршрута №29 з ДС «Карастаянавай» у 23.33. Адмяняецца работа аўтобуснага маршрута №122Э.

4-6 студзеня ў Мінску будзе зменшана колькасць рухомага складу ў гадзіны пік на наступных маршрутах гарадскога пасажырскага транспарту: аўтобусных №№ 2С, 42, 43Д, 61, 64, 84, 88С, 106, 127, 147, 153, 159, 921; тралейбусных №№ 3Д, 5, 8, 15, 30, 32, 33, 36, 44, 48, 53, 57, 59, 60, 64, 77; трамвайных №№ 3, 6, 11. Адмяняецца праца: аўтобусных маршрутаў №№ 122Э; 27Д, 98С (у вячэрнія гадзіны пік); тралейбусных маршрутаў №№ 26, 41Д; трамвайнага маршрута № 9.



## РАПУШКА — ПАД ЗАБАРОНАЙ

**Пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў краіне ўведзена забарона на лоўлю еўрапейскай рапушкі — штогод, пачынаючы з 2016 года, з 15 лістапада да 20 снежня.**

Устанаўленне забароны звязана з тым, што гэты від быў выключаны з Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь і цяпер з'яўляецца дазволеным для здабычы. У лістападзе-снежні ў еўрапейскай рапушкі — перыяд нерасту, а вымаць нерастуючую рыбу з вадаёмаў забаронена. Гэтая норма не адлюстравана ў Правілах вядзення рыбалоўнай гаспадаркі, паколькі на момант зацвярджэння іх у апошняй рэдакцыі еўрапейская рапушка яшчэ з'яўлялася «чырванакніжным» відам. Змяненне будзе ўлічана пры наступным унясенні карэктыў у гэты дакумент.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## У СТУДЭНТАЎ БНТУ З'ЯВІЦЦА НОВЫ ІНТЭРНАТ

**Адпаведны кантракт у частцы будаўніцтва «студэнцкага інтэрната з выкарыстаннем бязвыплатнай кітайскай дапамогі» падпісаны ў Міністэрстве адукацыі Беларусі.**

Як расказаў **намеснік міністра адукацыі Сяргей РУДЫ**, інтэрнат будзе пабудаваны ў межах праспекта Дзяржынскага, вуліц Сямашкі і Чурлёніса. Кітайскі бок выдзеліў на рэалізацыю праекта больш за $ 40 млн. Узвядзенне аб'екта даручана «25 кампаніі кітайскай Карпарацыі па чыгуначным будаўніцтве».

Інтэрнат разлічаны на 1032 месцы з размяшчэннем на першым паверсе аб'ектаў грамадскага харчавання, амбулаторыі, адміністрацыйных памяшканняў, памяшканняў для культурна-масавых мерапрыемстваў і бытавога абслугоўвання, фізкультурна-аздараўленчых памяшканняў і іншых.

Плануецца, што ў інтэрнаце будуць пражываць студэнты з Кітая і Беларусі — усе яны навучаюцца ў БНТУ. Будаўніцтва будзе завершана да 1 студзеня 2018 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ЭВАЛЮЦЫЯ САЦЫЯЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ ПРАЦЯГНЕЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— А такіх франтальных мер падтрымкі, як сямейны капітал, не чакаецца?***

— Мы пастаянна ўдасканальваем сістэму падтрымкі сем'яў з дзецьмі. У Беларусі гэтая сістэма разгалінавана па кірунках і маштабная па фінансаванні. Яна ўключае значныя меры па падтрыманні даходаў сем'яў (толькі дзіцячых дапамог выплачваецца 11 відаў), ільготы і гарантыі ў сферы працы і падаткаабкладання, аказанне фінансавай дапамогі пры будаўніцтве і рэканструкцыі жылля, а таксама меры па развіцці сеткі ўстаноў адукацыі, культуры, аховы здароўя. Па некаторых пазіцыях Беларусь знаходзіцца наперадзе краін-суседак з вялікім адрывам.

Дзяржава працягне развіваць сацыяльныя праграмы, накіраваныя на падтрымку юнага пакалення беларусаў, сем'яў з дзецьмі, на стварэнне спрыяльных умоў для іх дзейнасці.

***— Якія новыя падыходы будуць ужыты ў рэспубліцы для вырашэння праблем здароўя нацыі?***

— Новым этапам у аказанні медыцынскай дапамогі стануць скрынінгавыя мерапрыемствы па раннім выяўленні анкалагічнай паталогіі (толькі ў 2016 годзе на гэтыя мэты прадугледжваецца больш за Br375 млрд). Своечасовае выяўленне анкалагічных захворванняў дазволіць дасягнуць прарыву ў лячэнні пацыентаў, а значыць, яны будуць жыць даўжэй і, што вельмі важна, з лепшай якасцю жыцця.

Упершыню асобны блок дзяржпраграмы прысвечаны барацьбе з неінфекцыйнымі захворваннямі. Гаворка ідзе пра паніжэнне ўплыву фактараў рызыкі, якія з'яўляюцца асноўнымі прычынамі захворвання і смяротнасці ад хвароб сістэмы кровазвароту, новаўтварэнняў, цукровага дыябету, захворванняў органаў дыхання і інш.

***— П'янства — адзін з фактараў рызыкі. Якія метады барацьбы з алкагалізацыяй насельніцтва дзейсныя і эфектыўныя? Ці будзе развівацца сетка выцвярэзнікаў і ЛПП у Беларусі?***

— У Мінску, абласных цэнтрах і буйных гарадах функцыянуе 20 спецыялізаваных ізалятараў (так цяпер завуцца медвыцвярэзнікі). Павялічваць іх колькасць не плануецца.

У тым, што існуюць такія ўстановы, не бачу нічога дрэннага, хутчэй наадварот. Гэта дазваляе прадухіліць парушэнні і злачынствы, прычынай якіх з'яўляецца п'янства. Кожнае чацвёртае злачынства ў краіне ўчыняецца ў стане алкагольнага ап'янення, а доля «п'яных» забойстваў, цяжкіх цялесных пашкоджанняў, рабаванняў, разбойных нападаў, хуліганстваў дасягае 70—80%. Ужыванне алкаголю з'яўляецца першапрычынай гвалту ў сям'і, сацыяльнага сіроцтва.

Ёсць у краіне і ЛПП. Разам з тым лічу, што будучыня — за рэабілітацыйнымі цэнтрамі пры ўстановах аховы здароўя і грамадскіх фарміраваннях. Іх неабходна ствараць ва ўсіх гарадах з колькасцю жыхароў больш за 100 тыс. чалавек. Праграмы рэабілітацыі, заснаваныя на самых сучасных методыках, дадуць станоўчы эфект, прадухіляць дэградацыю асобы, дапамогуць захаваць сем'і.

Безумоўна, вельмі важна фарміраваць у беларусаў дакладныя ўстаноўкі на здаровы лад жыцця, на паводзіны, якія захоўваюць здароўе. Таму такая ўвага надаецца развіццю ў краіне фізкультуры і спорту. Пастаўлена амбіцыйная задача павялічыць у 1,5—2 разы колькасць людзей, якія актыўна займаюцца фізкультурай і спортам (з сённяшніх 20% да 30-40%), задзейнічаць у поўным аб'ёме спартыўныя аб'екты.

Беларусь дасягнула ўражвальных поспехаў у аказанні спецыялізаванай дапамогі, у прымяненні высокатэхналагічных метадаў лячэння. Але асаблівая ўвага ў найбліжэйшы час будзе нададзена першаснаму звяну аховы здароўя.

***— Паколькі прыватным арганізацыям аховы здароўя ўжо дазволілі выдаваць бальнічныя лісты, нагрузка на паліклінікі знізіцца. І якасць абслугоўвання павінна стаць лепшай. Дарэчы, якое ваша стаўленне да прапановы, каб работнікі маглі не афармляць бюлетэнь пры лёгкім недамаганні да трох працоўных дзён? Гэта быў бы яшчэ адзін крок да разгрузкі паліклінік.***

— Не лічу, што гэтае пытанне трэба рэгламентаваць на ўзроўні нарматыўнага прававога акта — гэта сфера адносін наймальніка і работніка, і яна можа быць урэгулявана калектыўным дагаворам.

***— Не магу не задаць яшчэ адно пытанне, якое ў свой час бурна абмяркоўвалася, ды і цяпер знаходзіцца ў хвалі грамадскай увагі. На вашу думку, ці трэба ўводзіць плату за наведванне паліклінік?***

— На дадзеным этапе не. Неабходна ўдасканальваць працу паліклінік, укараняць сучасныя метады арганізацыі іх дзейнасці.

***— У развітых краінах пенсійны парог значна вышэйшы, чым у Беларусі. У адной узроставай катэгорыі з Беларуссю застаюцца толькі Расія і Узбекістан. Якія перспектывы ў нашай краіне па павелічэнні ўзросту выхаду на пенсію ўвогуле і ў дачыненні жанчын у прыватнасці?***

— Прэзідэнт Беларусі неаднаразова адзначаў, што павышаць пенсійны ўзрост трэба, але пры ўмове, што людзі выкажуцца «за».

Палеміка па пытанні павышэння пенсійнага парога вядзецца вельмі актыўна. Сапраўды, пенсійны ўзрост у нас нізкі. Ён не ўлічвае ні эканамічных рэалій, ні тую акалічнасць, што расце сярэдняя працягласць жыцця і, адпаведна, падаўжаецца перыяд атрымання пенсіі. Так, жанчыны атрымліваюць пенсію ў сярэднім больш як 25 гадоў. Пры гэтым большасць з іх, дасягнуўшы 55 гадоў, працягвае працаваць.

Мне ўяўляецца, што да пытання аб павышэнні пенсійнага парога ў будучыні мы прыйдзем так ці інакш.

Сёлета мне споўнілася 55 гадоў, не раблю з гэтага сакрэту. Многія з маіх аднагодак (з кім я вучылася ў школе, у інстытуце, мы па-ранейшаму сустракаемся, кантактуем) на пенсію не пайшлі. Азірнецеся вакол: большасць жанчын у 55 гадоў яшчэ поўныя сіл, у іх ёсць досвед і жаданне працаваць, гэта ўзрост рэалізацыі. Вядома, многае залежыць ад стану здароўя і патэнцыялу чалавека.

***— Я перакананa, што пенсія не павінна быць бонусам да зарплаты, за выключэннем, мабыць, самых нізкааплатных работ. Прамое прызначэнне пенсій — гэта выплаты непрацаздольным людзям, якія з аб'ектыўных прычын не могуць працаваць і зарабляць сабе на жыццё. У Беларусі ж кожны чацвёрты пенсіянер працягвае працоўную дзейнасць, атрымліваючы заробатную плату і практычна поўны памер працоўнай пенсіі. Ці плануецца змяняць заканадаўства ў дачыненні да пенсіянераў, якія працуюць?***

— Пытанне гэтае вельмі далікатнае. На выплату пенсій пенсіянерам, якія працуюць, накіроўваюцца вялікія фінансавыя рэсурсы. А гэтыя сродкі маглі б пайсці на павелічэнне пенсій тым, хто сапраўды ўжо не можа працаваць і ў каго пенсія — адзіная крыніца даходу. Па нашым заканадаўстве, пенсія пенсіянерам, якія працуюць, абмяжоўваецца нязначна. Пры гэтым памер заробку, які атрымлівае пенсіянер, не аказвае ўплыву на памер пенсіі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***— Ва ўмовах старэння насельніцтва ўсё больш пажылых людзей застаюцца ў адзіноце пры жывых і здаровых сваяках, спадзеючыся на дапамогу дзяржавы, сацработнікаў. Ці трэба, на вашу думку, узмацняць адказнасць дарослых працаздольных дзяцей за бацькоў?***

— Кодэксам аб шлюбе і сям'і рэгламентуецца абавязак паўналетніх працаздольных дзяцей клапаціцца аб сваіх непрацаздольных бацьках і аказваць ім неабходную дапамогу. У заканадаўстве дастаткова норм, якія дазваляюць прыцягнуць працаздольных дзяцей да ўтрымання бацькоў, якія маюць патрэбу ў матэрыяльнай падтрымцы.

Але, разумееце, ніякім законам (старым або новым) не прымусіш любіць і берагчы сваіх блізкіх. Гэтую культуру ўзаемаадносін паміж пакаленнямі трэба выхоўваць з дзяцінства.

***— У 2015 годзе вы ўзначальвалі дзяржаўную камісію па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных выпрабаванняў ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Зыходзячы з аналізу гэтай кампаніі, якія навацыі рыхтуюцца для абітурыентаў 2016 года?***

— У Беларусі створаны празрысты механізм фарміравання студэнцкай аўдыторыі, сур'ёзных парушэнняў падчас уступных выпрабаванняў не выяўлена. Як паказаў аналіз работы і зваротаў грамадзян, прынцыповых змены ў правілы прыёму не патрабуюцца, але некаторыя карэкціроўкі неабходны.

Так, прапануюцца асаблівы парадак прыёму ў педагагічныя ВНУ выпускнікоў профільных класаў педагагічнага кірунку. Плануецца даць ім права паступлення без уступных выпрабаванняў, калі адзнакі па ўсіх школьных прадметах — 7 і вышэй, па профільных вучэбных дысцыплінах — не ніжэй за 9 балаў. Акрамя таго, абітурыенту пры паступленні на педагагічную спецыяльнасць у 2016 годзе абавязкова спатрэбіцца рэкамендацыя педсавета ўстановы адукацыі, якую ён скончыў.

Я лічу, што гэта правільна. Дарэчы, пра гэта неаднаразова даводзілася чуць на сустрэчах у педагагічных калектывах. У педВНУ павінны ісці маладыя людзі, якія захоплены гэтай прафесіяй і маюць да яе здольнасці, а не проста суіскальнікі дыплома аб вышэйшай адукацыі. Бо настаўнік — прафесія адмысловая, і адбор абітурыентаў павінен грунтавацца не толькі на выніках ЦТ, але і на характарыстыцы асобы.

І яшчэ. Для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы на спецыяльнасці фізічнай культуры і спорту плануецца такая новая норма, як наяўнасць спартыўнага разраду (звання). Гэта таксама дазволіць прыцягнуць прафесійна арыентаваных абітурыентаў, якія маюць не толькі высокую фізпадрыхтоўку, але і навыкі ў пэўным відзе спорту.

Быў зварот ад маці дзіцяці-інваліда наконт таго, што яна не можа паступіць на завочнае аддзяленне без даведкі аб працы, а працаваць не можа з прычыны неабходнасці даглядаць сваё дзіця. Лічу, што права на паступленне ў ВНУ ў такіх людзей павінна быць. Іх імкненне атрымаць прафесію трэба толькі вітаць.

***— Паводле інфармацыі прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі, з 2017 года абітурыентам плануецца даць магчымасць здаваць ЦТ па чатырох навучальных прадметах замест сённяшніх трох (чацвёрты тэст прапануецца зрабіць неабавязковым). Акрамя таго, не выключаецца магчымасць прызнання вынікаў ЦТ сапраўднымі на працягу двух гадоў.***

— Пакуль пра гэтыя навацыі гаварыць ранавата — пытанне знаходзіцца ў стадыі абмеркавання. Гэтыя прапановы Міністэрства адукацыі будуць старанна прапрацаваны.

***— Цікава, ці скароцяць летнія канікулы школьнікам? І летні водпуск настаўнікам?***

— Не, вядома ж. Пра гэта нават гаворка не ідзе.

Я перакананa, што трэба максімальную ўвагу надаць здароўю школьнікаў, якое пагаршаецца ў тым ліку з прычыны перагрузак — урокі, гурткі, секцыі... Запланавана сумесная калегія міністэрстваў адукацыі і аховы здароўя, на якой будзем абмяркоўваць, як увязаць навучальную нагрузку з захаваннем здароўя школьнікаў. Важная ў гэтым пытанні і роля бацькоў. Менавіта яны павінны вызначыць збалансаваны аб'ём дадатковых заняткаў у секцыях, гуртках, клубах, якія забяспечвае неабходнае развіццё дзіцяці, але не вядзе да іх перагамлення і страты цікавасці да заняткаў.

***— У Беларусі ў адрозненне ад іншых краін СНД няма франтальнага расслаення грамадства па ўзроўні даходаў. Тым не менш, ці актуальнае для нашай краіны пытанне ўвядзення падатку на багатых?***

— Адсутнасць такога расслаення, у прыватнасці, была адной з прычын, з якой сем гадоў таму у Беларусі перайшлі ад прагрэсіўнага падаходнага падатку (калі больш высокія даходы абкладаліся ў больш высокім памеры) да адзінай падатковай стаўкі. Цяпер незалежна ад таго, які памер даходу мае той або іншы грамадзянін, з яго збіраецца падатак у памеры 13%. Пры гэтым, натуральна, чым большая сума даходу, тым большая і сума падаходнага падатку.

А ўводзіць падатак на багатых? Для нашай краіны гэтае пытанне не з'яўляецца актуальным.

***— Хацелася б даведацца ваша меркаванне і па такім пытанні. Як вядома, адной з умоў павышэння турыстычнай прывабнасці з'яўляецца спрашчэнне парадку выдачы віз, адмена візавага збору. Ці патрэбны Беларусі гэтыя меры? Якія яшчэ фактары могуць стаць дадатковым стымулам для турыстаў-замежнікаў?***

— Сёння віза не патрэбна грамадзянам СНД (акрамя Туркменістана), Кубы, Сербіі і Чарнагорыі, Катара, Турцыі, Грузіі, Манголіі, Македоніі, Бразіліі, Венесуэлы, Ізраіля. Турысты з КНР пры наяўнасці шэнгенскай візы могуць наведваць Беларусь на перыяд да 3 дзён без візы. Афармленне віз грамадзянам Японіі ажыццяўляецца бясплатна. З 12 чэрвеня 2015 года пачаў дзейнічаць бязвізавы ўезд у Нацыянальны парк «Белавежская пушча» для замежных турыстаў, якія могуць знаходзіцца на тэрыторыі парка без віз не больш як тры дні. Лічу, што практыку бязвізавага наведвання асноўных турыстычных аб'ектаў Беларусі варта пашырыць.

Пры гэтым, паводле звестак сацыялагічных апытанняў, турысты называюць галоўнай перашкодай для падарожжаў менавіта неабходнасць афармляць візы. Таму лібералізацыя візавага рэжыму важная і патрэбная. Пэўныя кірункі гэтай работы намечаны.

Па-першае, на кожны год загадзя павінен быць вызначаны спіс значных мерапрыемстваў, наведаць якія можна ў бязвізавым рэжыме (буйныя фестывалі, выставы, спартыўныя мерапрыемствы). Прычым калі іншаземец ужо пабываў на такіх мерапрыемствах, добра было б прадугледзець выдачу яму дазволу на паўторны бязвізавы ўезд у Беларусь.

Па-другое, мэтазгодна прадугледзець магчымасць бязвізавага ўезду ў Беларусь на пэўны тэрмін для маючых шэнгенскую візу грамадзян дзяржаў, бяспечных у міграцыйным плане (па аналогіі з грамадзянамі КНР).

Па-трэцяе, трэба спрасціць парадак і зрабіць больш камфортнай працэдуру атрымання турыстычнай візы, у тым ліку ў аэрапорце. Неабходна разгледзець магчымасць атрымання электроннай візы і шэраг іншых мер.

Матэрыяльныя страты праз недаатрыманыя візавыя зборы будуць невялікімі (у год Беларусь выдае 20—30 тыс. турыстычных віз), а выгада — відавочная. Гэта не толькі развіццё сферы паслуг, але і павышэнне іміджу краіны: чым больш іншаземцаў наведаюць нашу краіну, тым больш добрага пра яе будуць ведаць у свеце. Наша Беларусь гэтага заслугоўвае.

■ Перадднавагоднія клопаты

# СВЯТОЧНЫ КАРП «ПА-КАРАЛЕЎСКУ»

## Карэспандэнт «Звязды» з калегамі на практыцы спазнаваў сакрэты традыцыйных калядных страў пад кіраўніцтвам вядомага эксперта беларускай кухні Алены Мікульчык

**Майстар-клас праводзіўся ў першай кулінарнай школе «Oede» (Мінск). На гэты раз сталічныя журналісты гатавалі, акрамя карпа, салату з гародніны, пірог з крушанкамі і кактэйль на аснове аўсянага кісялю. Адразу заўважу, што аўтару гэтых радкоў дазволілі займацца (пад кіраўніцтвам шэф-кухара) выключна карпам, таму менавіта на гэтую страву мы і звернем асноўную ўвагу.**

## Не шкадаваць масла

Увогуле такога карпа называюць «каралеўскім» за далікатны смак і параўнальную дарагоўлю інгрэдыентаў. Дазволіць сабе гэтую страву маглі толькі заможныя сем'і з-за вялікай колькасці топленага масла, неабходнага для смажання рыбы.

**Скібка — беларуская назва бутэрбродаў. Легенда гаворыць аб тым, што бутэрброд прыдумаў Мікалай Капернік, аднак беларусы пачалі жаваць свае скібкі значна раней.**

Алена Мікульчык лічыць, што топленае масла і ёсць галоўны сакрэт далікатнага сметанковага смаку, так што мяняць яго на алей катэгарычна не рэкамендуецца. Ёсць яшчэ адзін аргумент на карысць топленага масла — гэта яго карысныя ўласцівасці. У Аюрведзе яно лічыцца ці не адным з самых карысных прадуктаў для вашага арганізма ў цэлым і печані ў прыватнасці. Нашы продкі, несумненна, ведалі пра гаючыя ўласцівасці топленага масла, але была яшчэ адна прычына яго папулярнасці: яго можна захоўваць без халадзільніка некалькі месяцаў, а ў халодным месцы — да паўгода.

Зрабіць такое масла нескладана, гэта патрабуе толькі часу і акуратнасці. Вам трэба купіць звычайнае масла, лепш вялікай тлустасці, парэзаць на кавалкі, выкласці ў рондаль з тоўстым дном і паставіць на невялікі агонь. Яно растане, і з'явіцца белая пена. Гэта малочны бялок і цукар. Ваша задача — здымаць гэты накіп да таго часу, пакуль вадкасць не будзе аднастайнага колеру, без прымешак. Дарэчы, не спяшайцеся выкідаць тое, што сабралі: гэта будзе добрай закрасай вашых ранішніх каш, смак у рэштках саладкаваты і далікатны. Толькі вось яны, у адрозненне ад топленага масла, доўга не захоўваюцца.

Топленае масла можна прыгатаваць загадзя: хай стаіць у халадзільніку і чакае свайго часу, бо яго можна выкарыстоўваць не толькі ў гэтым рэцэпце. Напрыклад, калі абсмажыць для бутэрбродаў белы хлеб на такім масле, то ён будзе смачнейшым, чым на алеі, простая яечня на ім будзе больш духмянай.



Беларуская локшына — прамаці ўсіх чыпсаў.



Кісель лепш упрыгожыць елачкай з карыцы.



Дзве звяздоўскія рукі на чатыры патэльні.



Фота Надзеі БУЖАН.

Карпа «па-каралеўску» і падаваць трэба шыкоўна.

## Правіла «трох П»

Такім чынам, самае галоўнае і складанае мы ўжо зрабілі — маем пад рукой цёплае топленае масла. Прыступаем да рыбы. Можна выкарыстоўваць і невялікія цэлыя рыбіны, але калі вы не хочаце перабіраць ўсю трапезу костачкі, то лепш узяць філе карпа. Зразумела, што страва будзе больш смачнай, калі філе выразаць непасрэдна са свежай рыбы, аднак не кожны з нас можа гэта рабіць сапраўды прафесійна і хутка. А ў крамах сёння прадаецца замарожанае філе нашага айчыннага карпа.

Далей наш эксперт нагадаў правіла «трох П» гатавання рыбы: пасаліць, паперчыць і палімоніць. Затым кавалачкі рыбы абкачаць у муцэ, потым ва ўзбітых яйках і ў сухарах. Прычым не трэба шкадаваць ні яек, ні сухароў: ад гэтага залежыць, наколькі хрумсткай атрымаецца скурка, а гэта, як вядома, самая смачная частка рыбы. Выкласці падрыхтаванае філе ў разагрэтае топленае масла і на невялікім агні абсмажыць да прыгожага залацістага колеру. Адразу адкінуць на сурвэтку, каб увабралася лішняе масла, а затым падаваць як самастойную страву або з салатай. Непасрэдна ў нашым выпадку на гатаванне ўсіх страў было адведзена толькі тры гадзіны, таму я абсмажваў кавалачкі карпа адразу на чатырох патэльнях і даволі хутка. Аднак потым мы гэтага карпа змясцілі літаральна на 10 хвілін у духоўку, дзе ён цалкам і «дайшоў». Ад сябе асабіста дадам, што ў ідэале працуе правіла «чатырох П», калі трэба паесці. Мы гэта зрабілі — смак дзівосны...



### Пірог з крушанкамі ў выглядзе кошыкаў

**Састаў:** *250 г маргарыну, 300 г цукру, 1 яйка, 450 г мукі, 1 чайная лыжка сухой молатай цэдры апельсіна, 1/2 чайнай лыжкі соды, 1 сталовая лыжка воцату, у тры пальцы солі, 300-400 г свежых або замарожаных чарніц.*

Маргарын разрэзаць на кавалачкі і старанна расцерці з цукрам (200 г) пры дапамозе відэльца да аднастайнай масы. Затым дабавіць яйка, соль, молатую цэдру, соду, гашаную воцатам, добра змяшаць. У падрыхтаваную масу ўсыпаць 400 г мукі і хутка замясіць цеста. Яно атрымліваецца далікатным, пластычным, добра прымае і захоўвае форму, з яго можна ляпіць розныя фігуркі. Аддзяліць ад атрыманага цеста 1/3 — гэта будуць нашы крушанкі.

Для начынкі чарніцы змяшаць са 100 г цукру, 50 г мукі. Мука патрэбна для таго, каб начынка не была занадта рэдкай.

Цеста раскачаць у аладкі таўшчынёй каля аднаго сантыметра, асцярожна пакласці яго ў форму для запякання або патэльню, аформіць борцік і выкласці начынку. У пакінуты кавалачак цеста дабавіць трохі мукі, каб яно стала больш крутым, і раскрышыць над пірагом (або адрываць ад цеста маленькія кавалачкі і ўкладваць іх на начынку). Выпякаць пірог у разагрэтай да 180-200°С духоўцы 30-40 хвілін да залацістага колеру.

### Салата з гародніны з мядова-гарчычным соусам

Нарэзаць памідоры, агуркі і радыску, салату «Айсберг» парваць рукамі і заправіць падліўкай. У бюджэтным варыянце замест «Айсберга» можна ўзяць пекінскую капусту.

Для падліўкі бярэцца 100 мл аліўкавага алею, 30 мл ільнянога алею, сок 1 лімона (можна замяніць 1 лыжкай яблычнага воцату), сок 1 апельсіна, лыжка французскай гарчыцы (у зярнятках), лыжка мёду, соль і перац на смак.

### Кактэйль «Выкідайла» з мёдам і мятай

Ён робіцца на аснове аўсянага кісялю. Для кісялю: на 5 літраў вады — 500 г аўсяных круп. Для кактэйлю: 500 мл гатова кісялю, 200 мл вяршкоў (ад 20% тлустасці), 3 сталовыя лыжкі мёду, 1/2 ч. лыжкі карыцы, мята пры падачы.

Гатуем кісель. У гарачую гатаваную ваду (60-70) дабавіць змолатае ў кавамолцы зерне аўсу. Пакінуць на 2-3 дні для закісання ў цёплым месцы. Па заканчэнні гэтага часу закваска набудзе прыемны кіславаты пах. Вадкасць працадзіць праз некалькі слаёў марлі. Жамерыны выкінуць, а закваска можа захоўвацца ў халадзільніку да 2 тыдняў у закрытым посудзе. Для кісялю закваску паставіць на пліту і, пастаянна памешваючы, давесці да кіпення, калі кісель пачне гусцець. Чым лепшая якасць аўса, тым гусцейшы кісель.

У астылы да 40-30 градусаў кісель дабавіць вяршкі, мёд, карыцу. Калі кісель вельмі густы, то можна ўліць халоднай гатаванай вады. Падаваць халодным з мятай. Прапорцыі кісялю, вяршкоў, карыцы і мёду могуць вар'іравацца ў залежнасці ад вашага густу.

Аўсяны кісель прысутнічаў на ўсіх бяседах без выключэння. Яго падавалі заўсёды апошнім. Калі гаспадыня ставіла на стол гэты кісель, то госці дакладна ведалі, што ўсё смачнае скончылася і трэба ісці дадому. Таму ў народзе гэты напой называлі «выкідайла» або «выганяйла».

## Беларускія карані чыпсаў

А яшчэ нам паказалі, як рабіць сучасны фуршэт з нацыянальным каларытам. На стале размясціліся невялікія порцыі закусак па рэцэптах XIX стагоддзя. Гэта кнышы з бульбай, віргуны (хрушчы) з чырвоным перцам, скібкі, курыны паштэт і... чыпсы.

Скібка — беларуская назва бутэрбродаў. Легенда гаворыць аб тым, што бутэрброд прыдумаў Мікалай Капернік, аднак беларусы пачалі жаваць свае скібкі значна раней, лічыць Алена Мікульчык. Увогуле, скібка — гэта луста хлеба. У нас былі скібкі са шпінатам, бо зіма. А вясной на хлеб кладуць крапіву і снітку (рус. «сныть».). Гэтае зяленіва, умела прыгатаванае, паводле слоў нашага эксперта, вельмі смачнае і карыснае.

**Калі гаспадыня ставіла на стол кісель, то госці дакладна ведалі, што ўсё смачнае скончылася і трэба ісці дадому.**

Увага, чыпсы! Спадарыня Мікульчык ужо больш за 15 гадоў збірае старажытныя беларускія рэцэпты, таму яна дакладна ведае, што чыпсы прыдумалі нашы людзі. У сярэдзіне XIX стагоддзя была такая страва — локшына. Да гэтага на тэрыторыі Беларусі з'явілася бульба (прыкладна на 50-70 гадоў раней, чым у Расіі). Таму з бульбянога крухмалу рабілі тоненькія блінцы, якія потым сушылі і захоўвалі. Гэта быў фастфуд таго часу. Яго бралі з сабой у дарогу, каб у вольную хвілінку пахрумстаць. Калі такую локшыну заліць малаком, то атрымліваецца цудоўны малочны суп. Можна локшыну парэзаць на палоскі і пакласці ў булён.

**Рэдакцыя «Звязды» шчыра дзякуе прэс-службе кампаніі Visa ў Беларусі за арганізацыю майстар-класа.**

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
## извещает о проведении открытого аукциона по продаже гаража РСУ, принадлежащего ЗАО «Атлант»

| Лот № 1 | Гараж РСУ с инв. № 110/С-105223. Площадь –171,1 кв.м. Этажей – 1. Г.п. – 1977. | Брестская обл., Барановичский р-н, Столовичский с/с, 211, гараж РСУ, 1,4 км севернее д. Антоново | Начальная цена с НДС, доллары США | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 15 192 | 25 000 000 | 5 |

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,2438 га с кадастровым номером 120489000001000214. Целевое назначение – обслуживание гаража РСУ. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) - Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота №1 в течение 7 (семи) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Валюта торгов – доллар США. Валюта платежа – белорусский рубль.

Сумма для оплаты Лота № 1 производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Продавцу:
- затраты по проведению рыночной оценки Лота №1 в размере 4 200 000 (Четыре миллиона двести тысяч) белорусских рублей;
- затраты на организацию аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 6% (Шести процентов) от цены продажи Лота №1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Сумма для оплаты вознаграждения производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на дату подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 29.01.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 61**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by**.

*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже гаража РСУ ЗАО «Атлант»,* **проводимом 29 января 2016 г.**

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений – 27.01.2016 в 12.00.**

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Разумов Александр Михайлович, 8 (0163) 48-60-55.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
|---|---|
| Продавец | **Филиал ОАО «Гомельдрев» «Паркетный завод», Минская обл., г. Смолевичи, ул. Торговая 20, к. 47** |

**Предмет аукциона**

| *Наименование* | *Тип ТС* | *Регистрационный знак* | *Год выпуска* | *Двигатель* |
|---|---|---|---|---|
| Транспортное средство Volkswagen Transporter | микро-автобус вагон | 9483 ВС-5 | 1998 | бензин, 2500 см$^3$ |

**Начальная цена с НДС 20% – 38 594 880 белорусских рублей (снижена на 20%)**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г.Минску и Минской области, код 739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **в газете «Звязда» от 18.09.2015**

**Аукцион состоится 21.01.2016 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 20.01.2016 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

И З В Е Щ Е Н И Е О П Р О В Е Д Е Н И И А У К Ц И О Н А

# РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 28 января 2016 года проводит 2-ой открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 11 | Грузовой КамАЗ-4310 ш. 016759 дв. 867014 1986 г. 4 кат. 23970 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 12 | Грузовой КамАЗ-43105 ш. 1612 дв. 649309 1984 г. 4 кат. 91836 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 13 | Грузовой КамАЗ-43106 ш. 0005713 дв. 0696942 1990 г. 4 кат. 68034 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 14 | Грузовой Урал-43202 ш. 117501 дв. 444985 1989 г. 4 кат. 66751 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 15 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 105783 дв. 313186 1988 г. 4 кат. 44140 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 16 | Грузовой КамАЗ-4310 ш. 018092 дв. 884656 1986 г. 4 кат. 85343 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 17 | Грузовой КамАЗ-43106 ш. 0000385 дв. 438314 1989 г. 4 кат. 63182 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 18 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110038004 дв. 562020 1980 г. 4 кат. 314 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 110 000 000 | 11 000 000 |
| 19 | Грузовой Урал-4320 ш. 104432 дв. 306235 1983 г. 4 кат. 27372 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 20 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 160614 дв. 692856 1990 г. 4 кат. 59558 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 21 | Грузовой Урал-43202 ш. 066317 дв. 997362 1986 г. 4 кат. 76990 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 22 | Грузовой Урал-43202 ш. 078217 дв. 978940 1987 г. 4 кат. 63257 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 23 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 0100065 дв. 274292 1988 г. 4 кат. 3958 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 24 | Грузовой КамАЗ-43105 ш. 663 дв. 619659 1984 г. 4 кат. 12916 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 25 | Седельный тягач КамАЗ-5410 ш. 031445 дв. 0119205 1979 г. 4 кат. 38501 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 26 | Автошасси МАЗ-5334 ш. 121334 дв. 9029997 1990 г. 4 кат. 95050 км, Кузов-фургон КМ-500 №0158 1990 г. 4 кат. | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 27 | Седельный тягач КамАЗ-5410 ш. 19046 дв. б/н 1978 г. 4 кат. 111983 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 47 000 000 | 4 700 000 |
| 28 | Седельный тягач КамАЗ-54112 ш. 0021170 дв. 0417240 1989 г. 4 кат. 73914 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 29 | Грузовой КамАЗ-43105 ш. 0015759 дв. 0220271 1988 г. 4 кат. 99560 км | г. Дзержинск, в/ч 74962 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 30 | Специальный автомобиль УРАЛ-375А с кузовом-фургоном К2.375 в составе: Кузов-фургон К2.375 № 020271 1981 г. 2 кат. Автошасси УРАЛ-375А ш. 345755 дв. 293931 1981 г. 3 кат. 887 км | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 62 000 000 | 6 200 000 |
| 31 | Специальный автомобиль УРАЛ-375 с кузов-фургоном К2.375 в составе: Кузов-фургон К2.375 № 030386 1981 г. 2 кат. Автошасси УРАЛ-375 ш. 346705 дв. 347238 1981 г. 3 кат. 819 км | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 62 000 000 | 6 200 000 |
| 32 | Специальный автомобиль КамАЗ-43101 с кузов-фургоном К1.4320Д в составе: Кузов-фургон К1.4320Д № 020222 1989 г. 2 кат. Автошасси КамАЗ-43101 ш. 0011610 дв. 0574982 1989 г. 4 кат. 1323 км | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 68 000 000 | 6 800 000 |
| 33 | Специальный автомобиль УРАЛ-375АМ с кузов-фургоном КБ1.375 в составе: Кузов-фургон КБ1.375 № 04150 1985 г. 2 кат. Автошасси УРАЛ-375АМ ш. 436657 дв. 390151 1985 г. 3 кат. 824 км | г. Барановичи, в/ч 97047 | 62 000 000 | 6 200 000 |
| 34 | Специальный автомобиль УРАЛ-375А с кузовом-фургоном К.375 в составе: Кузов-фургон К.375 № 02342 1980 г. 4 кат. Автошасси УРАЛ-375А ш. 320657 дв. 103276 1980 г. 3 кат. 2111 км | г. Барановичи, в/ч 97047 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 35 | Специальный автомобиль УРАЛ-375А с кузов-фургоном К.375 в составе: Кузов-фургон К.375 № 01610 1979 г. 4 кат. Автошасси УРАЛ-375А ш. 316536 дв. 064830 1979 г. 3 кат. 1509 км | г. Барановичи, в/ч 97047 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 36 | Специальный автомобиль УРАЛ-375А с кузов-фургоном К.375 в составе: Кузов-фургон К.375 № 04331 1982 г. 4 кат. Автошасси УРАЛ-375А ш. 375740 дв. 639371 1982 г. 3 кат. 1144 км | г. Барановичи, в/ч 97047 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 37 | Специальный автомобиль УРАЛ-375А с кузов-фургоном К1.375 в составе: Кузов-фургон К1.375 № 09089 1982 г. 4 кат. Автошасси УРАЛ-375А ш. 386455 дв. 746583 1982 г. 3 кат. 1118 км | г. Барановичи, в/ч 97047 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 38 | Специальный автомобиль УРАЛ-375А с кузовом-фургоном К1.375 в составе: Кузов-фургон К1.375 № 10072 1982 г. 4 кат. Автошасси УРАЛ-375А ш. 386655 дв. 751843 1982 г. 3 кат. 2279 км | г. Барановичи, в/ч 97047 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 39 | Специальный автомобиль УРАЛ-375АМ с кузовом-фургоном К.375 в составе: Кузов-фургон К.375 № 10347 1982 г. 4 кат. Автошасси УРАЛ-375АМ ш. 387759 дв. 761914 1982 г. 3 кат. 4175 км | г. Барановичи, в/ч 97047 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 40 | Кабелеукладчик П-286 без основного оборудования (демилитаризованный) № 85110772 в составе: Гусеничный тягач АТС-59Г-БЛ-2 № 5BN0849БЛ ш. 1141162 дв. 7АЕ0581Е 1985 г. 3 кат. 15 м/ч 185 км; Кабелеукладчик прицепной колесный одноосный ножевой № б/н 1985 г. 4 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 67 000 000 | 6 700 000 |
| 41 | Кабелеукладчик П-286 без основного оборудования (демилитаризованный) № 81060194 в составе: Гусеничный тягач АТС-59Г-БЛ-2 № 42С5184БЛ ш. 11370664 дв. 7АА0412Е 1981 г. 3 кат. 30 м/ч 666 км; Кабелеукладчик прицепной колесный одноосный ножевой № б/н 1981 г. 4 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 42 | Кабелеукладчик П-286 без основного оборудования (демилитаризованный) № 86010801 в составе: Гусеничный тягач АТС-59Г-БЛ-2 № 5ВТ1179БЛ ш. 114120530 дв. 7АЕ1027Е 1985 г. 3 кат. 25 м/ч 446 км; Кабелеукладчик прицепной колесный одноосный ножевой № б/н 1985 г. 4 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 43 | Кабелеукладчик П-286 без основного оборудования (демилитаризованный) № 82090362 в составе: Гусеничный тягач АТС-59Г-БЛ-2 № 36R4643БЛ ш. 11380623 дв. 7АВ0541Е 1981 г. 3 кат. 10 м/ч 186 км; Кабелеукладчик прицепной колесный одноосный ножевой № б/н 1981 г. 4 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 67 000 000 | 6 700 000 |
| 44 | Кабелеукладчик П-286 без основного оборудования (демилитаризованный) № 81070202 в составе: Гусеничный тягач АТС-59Г-БЛ-2 № 42С3618БЛ ш. 11370649 дв. 7АА0219Е 1981 г. 3 кат. 22 м/ч 134 км; Кабелеукладчик прицепной колесный одноосный ножевой № б/н 1981 г. 4 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 67 000 000 | 6 700 000 |
| 45 | Кабелеукладчик П-286 без основного оборудования (демилитаризованный) № 82100376 в составе: Гусеничный тягач АТС-59Г-БЛ-2 № 53R5833БЛ ш. 1138064 дв. 7АВ0739Е 1981 г. 3 кат. 60 м/ч 135 км; Кабелеукладчик прицепной колесный одноосный ножевой № б/н 1981 г. 4 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 67 000 000 | 6 700 000 |
| 46 | Кабелеукладчик П-286 без основного оборудования (демилитаризованный) № 81080207 в составе: Гусеничный тягач АТС-59Г-БЛ-2 № 54С4205БЛ ш. 11370853 дв. 7АА0443Е 1981 г. 3 кат. 20 м/ч 540 км; Кабелеукладчик прицепной колесный одноосный ножевой № б/н 1981 г. 4 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 65 000 000 | 6 500 000 |
| 47 | Кабелеукладчик П-286 без основного оборудования (демилитаризованный) № 86020809 в составе: Гусеничный тягач АТС-59Г-БЛ-2 № 5ВТ1167БЛ ш. 114120525 дв. 7АЕ0963Е 1985 г. 3 кат. 50 м/ч 124 км; Кабелеукладчик прицепной колесный одноосный ножевой № б/н 1985 г. 4 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 67 000 000 | 6 700 000 |
| 48 | Кабелеукладчик П-286 без основного оборудования (демилитаризованный) № 81070203 в составе: Гусеничный тягач АТС-59Г-БЛ-2 № 42С3617БЛ ш. 11370652 дв. 7АА0346Е 1981 г. 3 кат. 18 м/ч 158 км; Кабелеукладчик прицепной колесный одноосный ножевой № б/н 1981 г. 4 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 67 000 000 | 6 700 000 |
| 49 | Кабелеукладчик П-286 без основного оборудования (демилитаризованный) № 87063072 в составе: Гусеничный тягач АТС-59Г-БЛ-2 № Е03ТБЛ438 ш. 11430431 дв. 7АЕ0151Е 1987 г. 3 кат. 9 м/ч 129 км; Кабелеукладчик прицепной колесный одноосный ножевой № б/н 1987 г. 4 кат. | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 75 000 000 | 7 500 000 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 28 января 2016 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 25 января 2016 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, обеспечение штрафа и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.**
**Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

# ДЛЯ ЎСТОЙЛІВАСЦІ ЭКАНОМІКІ ПАТРЭБНА ШМАТ ПУНКТАЎ АПОРЫ

## Размова пра гэта — з азербайджанскім паслом у нашай краіне

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Азербайджанскай Рэспублікі ў Беларусі Ісфандзіяр Бахціяр аглы Вагабзадэ ўзначальвае дыпламатычную місію ў Мінску пяты год. Доктар філалагічных навук, прафесар, вопытны дыпламат і літаратуразнавец, ён вядомы яшчэ і тым, што ў вольны час перакладае Максіма Багдановіча і Янку Купалу на родную мову, спрабуючы праз іх паэзію разгледзець нацыянальны код беларусаў. Але нагодай для нашай размовы стаў сучасны стан спраў у Азербайджане. У глабалізаваным свеце ўсе мы настолькі звязаныя адно з адным, што ад поспеху і ўстойлівасці кожнага залежыць агульная карціна. І вельмі важным становіцца разуменне шляхоў пераадольвання цяжкасцяў тымі, каму гэта ўдаецца.**



***— Спадар пасол, падзенне сусветных цэн на нафту закранула і эканоміку Азербайджана. Якія меры прымае кіраўніцтва вашай краіны, каб адказаць на глабальныя выклікі?***

— У той самы дзень, калі Цэнтрабанк Азербайджана аб'явіў аб пераходзе на плаваючы курс маната і калі адбылася чарговая дэвальвацыя нацыянальнай валюты, прэзідэнт нашай краіны Ільхам Аліеў падпісаў вельмі важныя указы, накіраваныя на лібералізацыю эканомікі.

Кіраўнік дзяржавы распарадзіўся скараціць колькасць ліцэнзій на вядзенне бізнесу і забяспечыць празрыстасць пры іх выдачы, а таксама знізіў пошліны. Такім чынам былі створаны ўмовы для яшчэ больш свабоднага развіцця бізнесу.

***— Наколькі эканоміка краіны аказалася падрыхтаванай да крызісу?***

— Да няпростых часоў Азербайджан падышоў досыць падрыхтаваным. За апошнія гады краіна цалкам пераўтварылася, яна дасягнула вялікіх поспехаў. Дастаткова сказаць, што за папярэднія 10 гадоў эканоміка Азербайджана вырасла ўтрая.

Гэтага ўдалося дасягнуць дзякуючы мадэрнізацыі эканомікі, развіццю сельскай гаспадаркі. Разам з тым не заставаліся ў баку і пытанні развіцця культуры, адраджэння духоўных каштоўнасцяў, сацыяльнай абароны насельніцтва. Кіраўніцтва краіны праводзіла маштабныя аднаўленчыя работы: будаваліся сацыяльныя аб'екты, жыллё. Безумоўна, росквіт Азербайджана быў дасягнуты ў многім дзякуючы моцнаму нафтагазаваму сектару.

Акрамя агульнавядомых нафтаправода Баку — Тбілісі — Джейхан і газаправода Баку —Тбілісі — Эрзурум, мы пашыралі «Паўднёвы газавы калідор», будавалі Трансанаталійскі газаправод (TANAP) і плануем пачаць будаўніцтва Трансадрыятычнага газаправода (TAP), па якіх «блакітнае паліва» з Азербайджана пойдзе ў Еўропу.

Ва ўсіх гэтых праектах Азербайджан выступае не толькі як ініцыятар, але і як актыўны ўдзельнік, які ўклаў немалыя сродкі.

Вельмі важна, што наша краіна ўмацоўвае эканамічныя сувязі з многімі краінамі свету: дастаткова азнаёміцца толькі з геаграфіяй экспартных паставак нашай прадукцыі, якая ахоплівае дзясяткі краін — ад высокаразвітых да тых, якія развіваюцца.

Усё гэта адбываецца разам з умацаваннем палітычных сувязяў з многімі краінамі, пачынаючы ад суседзяў — Турцыі, Ірана, Расіі, краін СНД, у тым ліку, Беларусі, і заканчваючы Еўропай і далёкімі ЗША, Бразіліяй, Аргенцінай і іншымі лацінаамерыканскімі краінамі. Незалежная і паслядоўная знешняя палітыка забяспечыла Азербайджану прызнанне на міжнароднай арэне.

***— Штуршком для развіцця нафтавага сектара ў Азербайджане паслужыла падпісанне першым прэзідэнтам Гейдарам Аліевым у 1994 годзе так званага «Кантракта века». Што зараз можа надаць неабходны імпульс эканоміцы?***

— Безумоўна, гэта быў дальнабачны і мудры крок у свой час. Дзякуючы міжнароднаму кантракту аб сумеснай распрацоўцы нафтавых радовішчаў у азербайджанскім сектары Каспійскага мора, падпісаным больш за 20 гадоў таму, пачалося ўкладанне буйных інвестыцый у развіццё краіны, якая цяпер атрымлівае вялікі прыбытак ад нафтавага сектара. Гэтыя сродкі выкарыстоўваюцца для паляпшэння жыцця грамадзян краіны, развіцця адукацыі, навучання моладзі ў вядомых ВНУ за мяжой.

Дзяржаўная нафтавая кампанія Азербайджана, якая з'яўляецца найбуйнейшым манапалістам у рэспубліцы, імкліва нарошчвае свой капітал і адпаведна актывы за мяжой, займаючы выгадныя бізнес-нішы не толькі ў суседніх краінах — Турцыі і Грузіі, але і ў Еўропе.

Аднак прэзідэнт Ільхам Аліеў надае прыярытэтную ўвагу і развіццю несыравіннага сектара: сельскай гаспадарцы, апрацоўчай і харчовай прамысловасці, сферы турызму і іншым.

Развіццё несыравіннага сектара дазваляе нам дасягнуць дыверсіфікаванага развіцця эканомікі краіны і забяспечыць яе ўстойлівасць.

Рэалізуюцца інфраструктурныя праекты. Адной з самых значных падзей адыходзячага года стала правядзенне першых Еўрапейскіх гульняў у Баку. Гульні атрымаліся сапраўды бліскучымі, з гэтым згодны і іх удзельнікі, і госці.

Але самае галоўнае, азербайджанцы за апошнія гады развіцця краіны сталі адчуваць сябе яшчэ больш самадастатковай, незалежнай і паспяховай дзяржавай, з моцнай эканомікай і арміяй.

***— Зусім нядаўна адбыўся чарговы афіцыйны візіт Ільхама Аліева ў Беларусь. Якія, на ваш погляд, галоўныя яго вынікі?***

— Перш за ўсё, гэты візіт пацвердзіў сяброўскія і цёплыя адносіны паміж прэзідэнтамі нашых краін. Усе словы, якія сказалі падчас гэтай сустрэчы кіраўнікі дзвюх дзяржаў, з'яўляюцца залогам паспяховага супрацоўніцтва. Ільхам Аліеў адзначыў, што Азербайджан бачыць пазітыўную дынаміку і вынiковасць па ўсіх кірунках супрацоўніцтва з Беларуссю.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

■ Энергетычная бяспека

# БУДАЎНІЦТВА АЭС: ДРУГІ ЭНЕРГАБЛОК ЗАПРАЦУЕ РАНЕЙ ЗАПЛАНАВАНАГА ТЭРМІНУ?

**На думку галоўнага інжынера беларускай АЭС Анатоля БОНДАРА, праект выконваецца згодна з вызначаным планам і ніякіх крытычных заўваг па будаўніцтве няма. Маніторынг работ на пляцоўцы вядзецца ў пастаянным рэжыме, у тым ліку Дзяржатамнаглядам, органамі будаўнічага нагляду. Больш за тое, цяпер работы выконваюцца так, што розніца па часе ўводу першага і другога энергаблокаў можа нават скарацiцца.**

### Строга па графіку

На галоўным энергетычным праекце краіны, што знаходзіцца паблізу Астраўца, сёння працуюць адразу на 102 аб'ектах. Пры гэтым варта адзначыць высокую запатрабаванасць айчынных спецыялістаў — каля 83% работ выконваюць будаўнічыя арганізацыі Беларусі, і толькі 17% работ — расійскія. Адна з самых галоўных задач, якая цяпер стаіць перад будаўнікамі — своечасова ўзвесці ахоўныя абалонкі, каб забяспечыць неабходныя ўмовы для мантажу рэактарнай установкі. Ужо ёсць чаканні, што мантаж корпуса рэактара першага энергаблока адбудзецца ў жніўні 2016 года. Згодна з графікам, яго запусцяць у лістападзе 2018 года, другі — у ліпені 2020-га. Аднак работы вядуцца вельмі інтэнсіўна, і можна чакаць, што розніца па часе ўводу першага і другога энергаблокаў можа скараціцца. «Падобная сітуацыя назіралася і падчас уводу замежных атамных станцый», — сказаў Анатоль Бондар.

Што тычыцца вынікаў 2015-га, то работы паралельна вяліся на двух энергаблоках станцыі, пабудаваны вучэбна-трэніровачны цэнтр і пажарнае дэпо. Цяпер работы працягваюцца ў будынках рэактараў першага і другога энергаблокаў, турбінных аддзяленнях, будынках кіравання, бяспекі, на рэзервовых дызельных электрастанцыях, градзірнях, у адміністрацыйна-бытавым корпусе. Як адзначае Анатоль Бондар, усе будаўнічыя работы на пляцоўцы АЭС выконваюцца па графіку.



### Айчынныя кампаніі таксама жадаюць прымаць удзел

Паводле інфармацыі **намесніка міністра энергетыкі Міхаіла МІХАДЗЮКА,** мантаж асноўнага абсталявання таксама павінен адбыцца ў вызначаныя тэрміны. Для першага энергаблока яно будзе на пляцоўцы АЭС у 2016 годзе. Ужо дастаўлены значныя аб'ёмы электратэхнічнага і іншага абсталявання. У наступным годзе для другога блока таксама пачне паступаць абсталяванне. Згодна з ацэнкамі, кошт яго для АЭС абыдзецца ў 3 млрд долараў.

Анатоль Бондар адзначыў, што беларускія кампаніі вырабляюць 7,5% агульнапрамысловага абсталявання для атамнай станцыі. Аднак зацікаўленасць у праекце сярод беларускіх кампаній расце. Напрыклад, высокую актыўнасць праяўляе Мінскі электратэхнічны завод імя В.І. Казлова. Часцей за ўсё айчынныя кампаніі становяцца пастаўшчыкамі рухавікоў, кабельнай прадукцыі, бакаў, металаканструкцый.

**ДЛЯ ДАВЕДКІ**

Корпус рэактара для першага энергаблока Беларускай АЭС вырабіў валгадонскі філіял АТ «АЭМ-тэхналогіі» «Атаммаш». Ён быў адгружаны з завода 14 кастрычніка. Абсталяванне важыць больш за 330 т, яго вышыня — 13 м, дыяметр — 4,5 м.

Ядзернае паліва для Беларускай АЭС будзе пастаўляць расійская кампанія «ТВЭЛ». Канкрэтныя тэрміны пастаўкі паліва пакуль не ўдакладняюцца. Кампанія «ТВЭЛ» уваходзіць у склад паліўнага дывізіёна дзяржкарпарацыі «Расатам». Кожны шосты энергетычны рэактар у свеце працуе на яе паліве.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by* ■

■ Інавацыі

### КАНСЕРВАНТ ДЛЯ ЛЬНЯНОГА АЛЕЮ

**У БДУ распрацаваны рэцэптуры і тэхналогіі атрымання ўстойлівага да акіслення льнянога алею.**

Супрацоўнікамі лабараторыі хіміі свабоднарадыкальных працэсаў Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем БДУ знойдзены новыя эфектыўныя і бяспечныя стабілізатары льнянога алею, якія дазваляюць значна павялічыць тэрміны яго захоўвання і палепшыць спажывецкія якасці. Акрамя таго, на аснове стабілізаванага льнянога алею створаны рэцэптуры шасці новых біялагічна актыўных дабавак, якія змяшчаюць каэнзім Q10, бэта-каранцін, селен — вітамін E, алей растаропшы, лютэін і вітаміны D3 і E.

Створаныя дабаўкі валодаюць антыаксідантнай, радыепратэктарнай, антыканцэрагеннай, герапратэктарнай, супрацьзапаленчай імунастымулюючай і адаптагеннай уласцівасцямі. Алей і біялагічна актыўныя дабаўкі на яго аснове выпрабляюцца на прадпрыемстве «Клуб «Фарм-Эка» ў Драгічыне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by* ■

### ПАЧЫНАЛІ ДОБРУЮ СПРАВУ...

**А ў рэальнасці, як паведамляе Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці, з абароту РСКУП «Ваўкавыскае» вывелі, папросту замарозілі грашовыя сродкі ў суме каля 160 тысяч еўра. Ды яшчэ прадпрыемства заплаціла каля 30 тысяч еўра за карыстанне банкаўскім крэдытам.**

Гэта здарылася з той прычыны, што ўжо прайшло 7 гадоў, як набылі ў нямецкай кампаніі і прынялі ў склад асноўных сродкаў установку для экстрагавання і прыгатавання алею, хаця яе па сённяшні дзень фактычна не запусцілі ў работу. Спробы рабіліся, але безвынікова, а толькі з дадатковымі затратамі. Прычым, з моманту пакупкі абсталявання кіраўніцтва прадпрыемства змянялася ўжо 5 разоў, і сённяшні дырэктар не можа патлумачыць, чаму праект правалены. На ўстаноўцы планавалі вырабляць 790 тон рапсавага алею ў год. Пры гэтым чысты даход праекта за 4 гады павінен быў скласці 871 мільён рублёў і чысты прыбытак — 643 мільёны рублёў. Аднак пакуль толькі страты...

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# Ігуменскі тракт



№ 45 (146)

■ Запрашальнік

## «СПЯШАЮСЯ ПАВІНШАВАЦЬ ВАС...»

**Традыцыя дасылаць калядныя і навагоднія паштоўкі — адна з самых прыемных. З нецярплівасцю ідзеш да паштовай скрыні, каб дастаць адтуль чаканую картку з цёплымі словамі, каляровымі ўзорамі. Або сам дасылаеш свае паштоўкі родным і сябрам, якіх рэдка бачыш. І такія пасланні лепей за ўсё нагадваюць пра тое, што помніш і любіш... Паштоўкі дасылалі і стагоддзе таму — і нават больш актыўна, чым сёння. Пра тое, як віншавалі ў пачатку XIX стагоддзя, можна даведацца на выставе калядных і навагодніх паштовак пад назвай «Спяшаюся павіншаваць Вас...», якая адкрылася ў Малой выставачнай зале палаца ў Нясвіжы.**




У новай экспазіцыі прадстаўлены старадаўнія карткі з прыватнай калекцыі У. Кустова, прывезенай з Санкт-Пецярбурга. На іх яскрава вымалёўваецца гісторыя святкавання Раства Хрыстовага. Робяцца зразумелымі традыцыі гэтага дня на мяжы стагоддзяў — у канцы XIX — пачатку XX, да гістарычных узрушэнняў рэвалюцыі 1917 года.

Калісьці (верагодна, як і сёння) асаблівай папулярнасцю карысталіся віншавальныя паштоўкі да свят, у тым ліку да Раства. Кожная серыя паштовак, прысвечаная пэўнай урачыстасці, мела свой набор знакаў, характэрных кампазіцый і сюжэтаў. У картках выяўляўся не толькі індывідуальны стыль аўтараў-мастакоў, але і асаблівасці культуры краін-вытворцаў у кожны перыяд іх гісторыі.

На выставе можна ўбачыць і іншыя прадметы, якія дапамогуць паглыбіцца ў атмасферу Раства, адчуць святочны дух эпохі пачатку XX стагоддзя

■ Спадчына ў законе

## ЗНОЙДЗЕНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ — У РЭЕСТР!

### Для вызначэння археалагічных артэфактаў будуць створаны спецыяльныя камісіі

**Згодна з Указам Прэзідэнта № 485, падпісаным літаральна нядаўна і скіраваным на ахову археалагічных аб'ектаў і артэфактаў, усе прыватныя ўладальнікі такіх каштоўных рэчаў павінны да 1 студзеня 2017 года ўключыць іх у дзяржаўны рэестр археалагічных артэфактаў. З гэтай нагоды пачалі з'яўляцца пытанні, што ж будзе лічыцца артэфактам і ці не трапяць туды выпадкова, напрыклад, сямейныя рэліквіі?..**

**Начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Ігар ЧАРНЯЎСКІ** патлумачыў, што ў наступным годзе ў Беларусі будзе створана спецыяльная камісія для вызначэння археалагічных артэфактаў. Прадуманы спецыяльны механізм, з дапамогай якога будзе адбывацца такая працэдура. У склад камісіі ўвойдуць спецыялісты адпаведнага профілю. Яна будзе дзейнічаць пры Мінскім гарвыканкаме і аблвыканкамах, куды можна будзе падаць свае прадметы, і камісія вызначыць — артэфакт гэта ці не.

Калі прадмет сапраўды з'яўляецца каштоўнасцю, яго трэба будзе зарэгістраваць у спецыяльным рэестры Нацыянальнай акадэміі навук. Але гэта не значыць, што Акадэмія навук забярэ артэфакт, адзначае Ігар Чарняўскі. Гэта робіцца з мэтай даведацца, што ў каго ёсць, каб мець магчымасць увесці прадметы ў навуковы і культурны ўжытак.



Капальнікі самі спрабуюць ацаніць тое, што ў іх ёсць.



Адзін са шматлікіх пярсцёнкаў (гэты, верагодна, — XVII стагоддзя), выстаўленых на Беларускім скарбашукальніцкім партале.

Спецыяліст адзначыў, што аматарам прыборнага пошуку і калекцыянерам не будзе чыніцца вялікіх перашкод у іх дзейнасці. Але рабіць гэта трэба згодна з заканадаўствам. Ва ўказе Прэзідэнта прапісана, што для правядзення пошуку археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў могуць прыцягвацца грамадзяне падчас студэнцкай практыкі, падсобныя рабочыя і спецыялісты на дагаворных асновах. Але галоўнае, што за такімі дзеяннямі ўсё роўна павінен стаяць прафесійны археолаг, пэўная профільная арганізацыя, на адрас і імя якой выдадзены адкрыты ліст — дазвол Нацыянальнай акадэміі навук на правядзенне археалагічных раскопак

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

■ Дзеля памяці

## «ВЯРТАЮЦЦА ДА НАС САЛДАТ ІМЁНЫ»

**Вельмі шмат давялося зведаць жыхарам Асіповіцкага раёна ў часы фашысцкай навалы. Пяць вёсак былі спалены разам з жыхарамі і не аднавіліся, а ўсяго пацярпелі ад захопнікаў 72 населеныя пункты. Перажытае на генным узроўні пераходзіць з пакалення ў пакаленне... Пра жахі вайны гаварылі на другіх краязнаўчых чытаннях бібліятэкараў раёна, якія называюцца «Вайна. Пошук. Памяць».**

Адкрываючы чытанні, дырэктар цэнтралізаванай бібліятэчнай сеткі Анжэла Хлус адзначыла, што менавіта бібліятэкары раёна ўзначалілі пошукавую краязнаўчую працу падчас 70-годдзя Перамогі. «Асабіста да мяне памяць пра вайну перайшла ад дзеда-франтавіка, які ваяваў разам з Машэравым; ад бабулі, якая маладой дзяўчынай дапамагала партызанам», — адзначыла яна.

Рукапісныя ўспаміны ветэранаў, іх аўтографы, копіі дакументаў з асабістых архіваў: фотаздымкі, лісты, паштоўкі, выразкі з газет; звесткі, атрыманыя ў вуснай форме, якія на працягу года збіралі бібліятэкары раёна, склалі аснову віртуальнага музея «Вяртаюцца да нас салдат імёны». А пад кіраўніцтвам намесніка старшыні райвыканкама А. Шаўлюгі пабачыў свет і папяровы дадатак да кнігі «Памяць» з пералікам воінаў, якія загінулі пры вызваленні раёна, і загінулых салдат-землякоў.

Вялікі ўнёсак у гэтую справу зрабіла ветэранка бібліятэчнай сістэмы Валянціна Логвін. Дзякуючы ёй быў вернуты з небыцця гераічны эпізод Вялікай Айчыннай вайны — бой за чыгуначны мост цераз Бярэзіну ля станцыі Ялізава (тады Свіслач) 30 чэрвеня 1941 года. Пошук, у якім удзельнічала і дырэктар ЦБС, увасобіўся ў кнігу, падрыхтаваную да выдання. А на гранітных плітах былі выбіты імёны 280 байцоў 8-й і 14-й асобных аднаўленчых чыгуначных батальёнаў, якія дагэтуль лічыліся без вестак прапаўшымі ў тым баі.

На краязнаўчых чытаннях адбылася дыскусія вакол пытання недастатковасці сучаснага патрыятычнага выхавання моладзі. Аднак начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Асіповіцкага райвыканкама Ірына Раманчук запэўніла, што тэма мінулай вайны на тэрыторыі раёна будзе і надалей належна даследавацца, а матэрыялы пошукаў — актыўна даводзіцца да жыхароў і вучняў школ.

**Віктар ХУРСІК**

■ Тапанімія

## ЁСЦЬ У ОРШЫ ТАКАЯ ВУЛІЦА...

**Не сакрэт, што ў нашай краіне вуліцы ў гарадах часта мянялі свае назвы. У старажытнай Оршы сумным «рэкардсменам» па перайменаваннях можна смела называць невялікую вуліцу, якая знаходзіцца амаль у цэнтры горада. Пасля таго, як на ёй прадпрымальнікам Вайнбергам у 1883 годзе быў заснаваны піваварны завод, на карце горада і з'явіўся Вайнбергаў завулак. Піва, дарэчы, славілася далёка за межамі Оршы. Нават атрымала некалькі залатых медалёў на міжнародных выставах.**

Дзесьці ў другой палове 1920-х гадоў завулак быў названы ў гонар Усевалада Ігнатоўскага, выдатнага вучонага і арганізатара асветы ў БССР, адметнага дзеяча новага беларускага Адраджэння. Для аршанцаў ён асабліва дарагі як аўтар думкі, што ў 850-х гадах Орша была цэнтрам удзельнага княства, а ў 1928 годзе Ігнатоўскі наведаў горад і выступіў у «Доме асветы». Праўда, калі яго беспадстаўна абвінавацілі ў «нацыянал-дэмакратызме» (каб пазбегнуць смерці ад рук сталінскіх катаў, ён у 1931 годзе скончыў жыццё самагубствам), была «рэпрэсавана» і назва вуліцы.

Яна стала насіць імя «першага чырвонага афіцэра» — сталінскага маршала Кліма Варашылава. Наогул, 1930-я гады — гэта вельмі складаны час, калі энтузіязм будаўніцтва новага жыцця спалучаўся з трагедыяй палітычных рэпрэсій. Вуліцу канца 1930-х гадоў можна смела назваць «расстралянай», бо, па сведчанні яе жыхара Я. Сакалова, на вуліцы было тады 26 дамоў, і толькі ў трох з іх не пабывалі агенты НКУС...



«Велічны гмах піўзавода» сёння.

У 1941 годзе фашысты і іх мясцовыя памагатыя хутка перайменавалі вуліцу ў нейтральную Браўэрштрасэ (Піваварaная вуліца). А ў другой палове 1940-х гадоў на вуліцы пачалося будаўніцтва прыватных дамоў. «Інтэлігенцкай» яна стала называцца, бо большасць пабудаваных дамоў належала настаўнікам, урачам, бухгалтарам.

Менавіта на ёй, у доме №10, у пасляваенны час жыла сям'я Уладзіміра Караткевіча. Тут ён жыў і ў 1956—1958 гадах, калі працаваў настаўнікам у Оршы. Сюды, на гэтую вуліцу, часта прыязджаў у родную хату, дзе добра пісалася. У яго было сваё працоўнае месца на гарышчы, у зацішку. Тут з-пад пяра Караткевіча выйшла славутая аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха». Каля роднай хаты цяпер расце каштан, які Уладзімір Сямёнавіч прывёз з Кіева і пасадзіў у памяць сяброў і родных, якія загінулі.

24 лістапада 1961 годзе вуліца была перайменавана ў вуліцу Касманаўтаў. З такой назвай яна назаўсёды ўвайшла ў гісторыю прыгожага беларускага пісьменства. «Самай мне любай вуліцай з усіх, што ёсць на зямлі» прысвечаны верш паэта «Вуліца Касманаўтаў». «Адзіная з тысяч вуліц, ты — святло маё і любоў», — усхвалявана пісаў малады творца. Было б цудоўна, каб так пра сваю вуліцу мог сказаць кожны гарадскі жыхар! А вуліца ў 1987 годзе атрымала імя Уладзіміра Караткевіча — вялікага сына Аршанскай зямлі. У дні святкавання 60-годдзя пісьменніка на вуліцы з'явіліся дзве мемарыяльныя дошкі. Адна — на пачатку вуліцы — з гарэльефам і аўтографам пісьменніка, выкананая скульптарам Юрыем Паляковым. Дарэчы, на ёй Караткевіч названы народным пісьменнікам Беларусі (хоць і не меў такога звання афіцыйна, але, безумоўна, яго заслужыў). Другая — на доме сям'і Караткевічаў. На жаль, пасля смерці сёлета ягонага апошняга гаспадара — мужа роднай пляменніцы Караткевіча, дом стаіць пусты і лёс яго пакуль невядомы...



Мемарыяльная дошка Уладзіміру Караткевічу.

А спускаецца вуліца да ўсімі любімага Дняпра, дзе знаходзіцца яшчэ адна важная і неабходная арганізацыя — станцыя выратавання на вадзе. Згадваюць тут і цікавую гісторыю з ліпамі, што растуць на самым беразе ракі, насупраць дома №19. Іх пасадзілі ў 1914 годзе, 14 дрэўцаў (па годзе пачатку Першай сусветнай вайны). Захавалася да нашага часу 11 (тры паваліла моцная бура ў жніўні 2000 года).

Вось такая маленькая вуліца з такой вялікай і багатай гісторыяй.

**Віктар ЛЮТЫНСКІ. Фота аўтара**

■ Архівы

# ЯК ЗМАГАЛІСЯ З ДУХОЎНАСЦЮ...

## ПЯЦЬ УДАРАЎ ПА РЭЛІГІІ

**У пачатку XX стагоддзя распачалася яшчэ адна вайна, пра якую мы ведаем зусім мала і не ўяўляем яе маштабаў, — гэта вайна з рэлігіяй. Зборнік дакументаў «Рэлігійнае жыццё на Міншчыне (1918—1941 гады)», выпушчаны Дзяржаўным архівам Мінскай вобласці сумесна з аддзелам рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі, сведчыць пра тое, што з рэлігіяй змагаліся ўсур'ёз, прычым самымі рознымі метадамі.**

### 1. Канфіскацыя маёмасці

Першыя дэкрэты савецкай улады пра свабоду сумлення і аддзяленне царквы ад дзяржавы і школы ад царквы былі прыняты ўжо ў 1918 годзе. Побач з досыць дэмакратычнымі пунктамі пра адукацыю і выхаванне з'явіліся і такія, што цалкам падрывалі матэрыяльны бок існавання царквы. Згодна з новым дакументам, ніякія царкоўныя і рэлігійныя ўстановы не мелі права валодаць маёмасцю. Яны пазбаўляліся таксама правоў юрыдычных асоб.

Будынкі цэркваў сталі лічыцца ўласнасцю дзяржавы. А царкоўныя службы былі абавязаны пісаць афіцыйныя звароты, каб ім дазволілі карыстацца сваімі храмамі.

Так, захаваўся дакумент, у якім відаць акурат такая сітуацыя, напісаны грамадой евангелічнай царквы лютэранскага веравызнання:

*«Згодна з пастановай Савета Народных Камісараў СССР, апублікаванай у газеце «Звязда» 1 студзеня 1922 года, мы, што падпісаліся ніжэй, просім аб перадачы ў карыстанне нашай рэлігійнай грамадзе царкоўнага будынка, які знаходзіцца на Захар'еўскай вуліцы, 90 (будынак былой нямецкай кірхі), разам з усімі прадметамі богаслужэння. Заўважаем, што ўся маёмасць, што належала евангельскай лютэранскай царкве, была забрана з-пад папячыцельства царкоўнага савета».*

### 2. Адабранне каштоўнасцяў

Моцны ўдар па інстытуце царквы ўлады нанеслі ў 1922 годзе, калі правялі кампанію па адабранні царкоўных каштоўнасцяў. Быў нават выдадзены архіпастырскі зварот епіскапа Мінскага і Тураўскага Мелхіседэка, у якім гаварылася, што здадзеныя царкоўныя каштоўнасці пойдуць на закупку спажывецкіх тавараў для дапамогі галодным. Гэтая мера была расцэнена як спроба адабраць у царквы апошнія рэсурсы, а таксама як сродак паслабіць уплыў царквы ў грамадстве.

Трагічнасць таго, што адбывалася, часткова перадаецца ў наступным дакуменце, напісаным на імя загадчыка ліквідацыйнага аддзела Народнага камісарыята юстыцыі таварыша Канакоціна:

*«Згодна з вашым асабістым распараджэннем каменданту будынка ўніверсітэта па вуліцы Шырокай было распачата зняцце крыжоў з купалоў былой Уваскрасенскай царквы, перададзенай універсітэту. Праведзеным абследаваннем на месцы, пры дапамозе пажарных лесак, спецыялістамі-рабочымі ўстаноўлена, што доступ лескамі магчымы толькі на адзін купал; для доступу да другога патрэбны рыштаванні. Сродкі, па дамоўленасці з рабочымі, у суме 500 рублёў былі своечасова выдзелены кіраўніцтвам універсітэта, аднак рабочыя, агледзеўшыся, адмовіліся ад дамоўленай платы. Для правядзення работ патрэбна 1500 рублёў, не лічачы рыштаванняў. Паведамляючы пра гэта, універсітэт просіць вашага ўдзелу рабочымі людзьмі і грашовымі сродкамі, бо з-за адсутнасці такіх выкананне работ зацягваецца. Рэктар БДУ прафесар Герчыкаў».*

### 3. Змаганне са святарамі

Нягледзячы на тое, што з дазволу мясцовых улад рэлігійныя аб'яднанні маглі карыстацца сваімі будынкамі, за любое парушэнне, нават самае фармальнае, аб'яднанне закрывалася, а храм і маёмасць канфіскоўваліся. Ёсць сведчанні, што Уладзімір Ленін сказаў, што чым больш святароў загіне, не пагаджаючыся аддаваць царкоўную маёмасць, тым лепш.

Пра тое, што такая мэтанакіраваная праца прыносіла пэўны плён, сведчыць наступны ліст, напісаны ў рэдакцыю «Звязды» дыяканам Самахвалавіцкай царквы Мінскай акругі Уладзімірам Прахарэцкім:

*«Зразумеўшы ўсю бессэнсоўнасць сваёй службы, я вырашыў кінуць і канчаткова парваць з усімі забабонамі, зразумеў правільны шлях, па якім трэба ісці, асэнсаваў падман і яўную недарэчнасць рэлігіі...»*

### 4. Непамерны падатак

Цэрквы абкладваліся такім падаткам, які часта выплаціць папросту не маглі.

Досыць гратэскна выглядае ліст, напісаны вернікамі праваслаўнага прыхода ў Стоўбцах тагачаснай Баранавіцкай вобласці, на арыгінале якога пастаўлена 160 подпісаў:

*«Дарагому правадыру нашаму бацьку Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну. Стаўбцоўскі фінаддзел абклаў духавенства нашай царквы падаткам каля 36 тысяч рублёў. Гэту суму не ў сілах выплаціць ні духавенства, ні прыхаджане, што ставіць пад пагрозу існаванне нашай грамады. Таму звяртаемся да цябе, дарагі наш настаўнік, з гарачай просьбай вызваліць нас ад прызначанага падатку і забяспечыць існаванне нашай царквы».*


486 ~~476~~

В редакцию газеты „Звезда", Советская 63.

Диакона Самохваловичской церкви, Минского округа, Владимира Прохорецкого

Заявление.

Поняв всю бессмысленность своей службы, я решил бросить ее окончательно, порвав со всеми предрассудками, понял учение Ленина, понял правильный путь по которому следует идти; познал обман и явную нелепость религии, ...

### 5. Перадача метрычных кніг

Цікава, што савецкія ўлады адной з першачарговых задач бачылі тое, каб забраць у цэркваў і касцёлаў метрычныя кнігі і перадаць абавязкі вядзення актаў грамадзянскага стану (нараджэнне, шлюб, смерць) ад царквы дзяржаве (аддзелам ЗАГС), што і было зроблена. Такім чынам, сям'я з-пад традыцыйнай апекі царквы цалкам трапіла пад апеку дзяржавы.

***

Усе гэтыя захады найбольш актыўна праводзіліся спецыяльна створаным Саюзам ваяўнічых бязбожнікаў. У 1932 годзе ў ім нават быў прыняты пяцігадовы план, у якім намячалася на працягу першага года закрыць усе духоўныя ўстановы, пазбавіць царкоўных служак харчовых картак, на працягу другога — закрыць цэрквы і забараніць выраб прадметаў культу, трэцяга — выслаць святароў, чацвёртага — закрыць культавыя будынкі ўсіх рэлігійных канфесій, пятага — замацаваць атрыманыя поспехі... Аднак гэты план праваліўся. Выкараніць рэлігію не ўдалося. Перапіс 1937 года паказаў, што пераважная большасць вясковых жыхароў, якая ў той час складала асноўную колькасць насельніцтва краіны, працягвае лічыць сябе вернікамі. Пасля гэтага многія з членаў Саюза бязбожнікаў былі рэпрэсаваныя...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

■ Беларусы замежжа

# «КАЛЫХАНКА» ВУЧЫЛА НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ








**Узорны дзіцячы фальклорны гурт з аграгарадка Міханавічы Мінскага раёна ўдзельнічаў у творчай сустрэчы з суайчыннікамі, якія жывуць далёка ад радзімы, але па-ранейшаму цікавяцца сваімі вытокамі і хацелі больш ведаць пра народную культуру.**

Ужо не першы раз у Беларусь прыязджаюць прадстаўнікі беларускай дыяспары з розных краін па дзяржаўнай праграме «Беларусы ў свеце». Каардынатарам праграмы з'яўляецца Міністэрства культуры, прынята яна была ў 2013 годзе. «Гэты адмысловы праект накіраваны на забеспячэнне комплекснага ўзаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў Беларусі з суайчыннікамі замежжа, далучэнне беларускай дыяспары да ўдзелу ў рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця нашай краіны, захаванне і падтрымку яе нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. Мэтай праграмы з'яўляюцца і стварэнне сістэмы дзяржаўнай падтрымкі, і развіццё партнёрскага супрацоўніцтва з беларусамі замежжа ў сацыяльна-эканамічнай, інфармацыйнай, адукацыйнай, культурнай і іншых сферах», — гаворыцца ў змесце праграмы.

У снежні Мінск наведала чарговая група з 20 чалавек з Расіі, Эстоніі, Літвы, Польшчы, Францыі, Італіі, Іспаніі, якія тым ці іншым чынам звязаны з беларускай культурай. Большасць з гэтых людзей кіруюць творчымі калектывамі, з'яўляюцца актыўнымі папулярызатарамі беларускай народнай культуры за мяжой. Дзякуючы ім за межамі радзімы знаёмяцца з нашай нацыянальнай самабытнасцю, праводзяцца канцэрты, святы і фестывалі.

Гэтым разам у рамках праекта прайшлі курсы па пашырэнню ведаў па захаванні, развіцці і трансляцыі народнай культуры. А таксама майстар-класы па засваенні народных промыслаў і рамёстваў, па вакальна-харавой і харэаграфічнай творчасці, абрадава-святочнай культуры. І адзін з гэтых класаў адбыўся на базе міханавіцкага Дома фальклору.

У невялікі дамок на ўскраіне аграгарадка, дзе ўжо больш за чвэрць стагоддзя збіраюцца аматары народных спеваў, прыйшлі цяперашнія выхаванцы «Калыханкі» — вучні пачатковых класаў — і тыя, хто ўжо выйшаў з гэтай узроставай катэгорыі, але па-ранейшаму застаецца спяваць, паказваць багатую песенную спадчыну, дапамагаць кіраўніцы і стваральніцы калектыву Ларысе Рыжковай. Калыханкаўцы паказалі землякам, як праводзяцца традыцыйныя дзіцячыя тыў, які збірае дзіцячую гульнявую спадчыну. У скарбонцы гурта народныя гульні амаль з усіх рэгіёнаў Беларусі.

— На гэтым майстар-класе мы паказвалі сваю методыку, як далучыць дзяцей да фальклору, як развіваць у іх пачуццё песні праз гульнявыя гукі і галасы, — кажа Ларыса Рыжкова. — І таму мы заўсёды гуляем у тыя гульні, у якія спрадвеку гулялі нашы продкі, калі яны былі дзецьмі. Гульні, у якіх дзеці фантазіруюць і вучацца супольна спяваць, праводзяцца ў полі, у двары, у хаце; яны мадэлююць сітуацыі земляробчых абрадаў.

Некаторыя з гасцей дзякуючы ўдзельнікам «Калыханкі» ўпершыню ўбачылі, як гуляюць у «Мак», «Верабейку», «Грушку», «Проса», «Ваўка і авечку», «Трыфана». Незвычайны ўрок з калыханкаўцамі прайшоў не дарма: нашы суайчыннікі павязуць у «свет далёкі» нашы старажытныя песні і гульні.



гульні, спявалі абрадавыя песні. Маленькія артысты ў традыцыйных строях заўсёды дэманструюць прыклад паважнага стаўлення да нацыянальнай культуры. Дарэчы, «Калыханка» — адзіны ў краіне калек-

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара**

■

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

## Организатор: Волосовичский сельский исполнительный комитет

| № лота | Местонахождение земельного участка | Площадь га, кадастровый номер | Условия и организация | Расходы по подготовке и изготовлению документов (руб.) | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| У-4 | д. Каминщина Лепельского района | 0.1500 га, кадастровый номер 222780404101000018 | - водоохранная зона озера Турицкое | 4 436 696 | 5 000 000 | 1 000 000 |
| У-5 | д. Каминщина Лепельского района | 0.1486 га, кадастровый номер 222780404101000019 | - водоохранная зона озера Турицкое<br>- расположен в охранной зоне линий электропередачи | 4 391 115 | 5 000 000 | 1 000 000 |

1. **Аукцион состоится 29 января 2016 года в 15.00** по адресу: Витебская область, Лепельский район, д. Новые Волосовичи, улица Центральная, дом 17.

2. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: д. Новые Волосовичи, улица Центральная, дом 17, Волосовичский сельский исполнительный комитет. **Последний день приема заявлений – 8 января 2016 года до 17.00.**

3. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Волосовичского сельисполкома № 3641301031037в филиале №211 ЦБУ №214 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 660, УНП 300039732, назначение платежа 04901, задатка в размере 20% от начальной цены объекта аукциона.

4. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, подтверждающую личность покупателя, представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, удостоверяющую личность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, за публикацию в средствах массовой информации и расходов по подготовке и изготовлению документации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о передаче в частную собственность победителю аукциона земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

**Контактные телефоны: 8(02132) 6-39-63; 6-11-99; V 8-0291-333-105.**

# Извещение о проведении 10 февраля 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | «Здание котельной» общей площадью 901,6 кв. м, инвентарный номер 632/С-17290, расположенное по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, Раковский с/с, около а.г. Раков, 3А (назначение: здание неустановленного назначения; составные части и принадлежности: три площадки асфальтобетонные с бетонными бортами, дорожка асфальтобетонная с бетонным бортом, ограждение (забор) металлическая сетка на бетонных столбах, рампа, дымовая труба кирпичная);<br>«здание мазутонасосной» общей площадью 244,1 кв.м, инвентарный номер 632/С-26412, расположенное по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, Раковский с/с, около д.Раков, ул.3А/1 (назначение: здание специализированное иного назначения; составные части и принадлежности: кирпичная пристройка, блочный подвал) |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь: 1,6834 га; кадастровый номер: 622000000001000099; целевое назначение: земельный участок для содержания и обслуживания котельной со вспомогательными зданиями и сооружениями |
| **Продавец имущества** | ОАО «НПО Центр», ул. Шаранговича, 19, ком. 304, 220018, г. Минск |
| **Организатор торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 4 055 037 772 белорусских рубля |
| **Сумма задатка** | 400 000 000 белорусских рублей |
| **Условие торгов (условие продажи)** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |
| **Обременения** | Аренда |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **10 февраля 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 05.01.2016 по 08.02.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»); (017)259-05-54, (029) 686-45-13 (ОАО «НПО Центр»).**

## РУП «Белпочта»

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ**

**для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте «Текущий ремонт зенитных фонарей в здании авторемонтной мастерской по ул. Лукьяновича, 6/2 в г. Минске».**

**Процедура переговоров состоится «30» декабря 2015 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел. 293-55-29, 293-55-28.

УНП 101015738

# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

## 29 января 2016 г. проводит открытый аукцион с условиями № 01-У-16 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Минский городской центр недвижимости

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на трех земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, пр. Дзержинского | 0,50 | для строительства объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями по пр. Дзержинского» (повышенной комфортности) | 2 252 194 817 | 340 000 000 | 53 155 609 | снос нежилых зданий по ул. Розы Люксембург, 89А | 373 470 000 руб. |
| 2 | г. Минск, ул. Радиальная – ул. Алтайская | 3,0810 | для строительства объекта «Жилая многоквартирная застройка по ул. Радиальная – ул. Алтайская» (повышенной комфортности) | 9 921 823 500 | 1 488 000 000 | 150 293 199 | отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Солтыса, 2, 4, 4А, 6, 6А, 6Б, 8, 8А.; пер Холмогорский 4-й, 2, 4, 4а, 6, 8; пер. Наклонный 1-й, 2а, 2Б; пер. Холмогорский 3-й, 3, 3 «А», 7, 7а | 29 473 410 900 руб. |
| 3 | г. Минск, ул. Волгоградская | 0,6583 | для строительства объекта «Многоквартирный жилой дом по ул. Волгоградской» (повышенной комфортности) | 2 729 508 963 | 410 000 000 | 191 969 241 | отселение и снос в установленном порядке жилых и нежилых строений по ул. Волгоградской, д. 82, 84; по ул. Новгородской, 3, 5. Демонтаж распределительных инженерных сетей | 57 294 298 600 руб. |

Основные условия проектирования и строительства объекта указаны в акте выбора места размещения земельных участков и прилагаемой к нему документации.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

**Аукцион состоится 29 января 2016 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 25 января 2016 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в УП «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона (его представитель), предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. № 6 с 4 января 2016 г. по 25 января 2016 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона*, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;**

* – единственный участник несостоявшегося аукциона – выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии и предоставлении земельного участка в аренду.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения) Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Апавяданне, прапанаванае на конкурс Валерыяй Радунь, на першы погляд, павінна быць больш разлічана на дзіцячую аўдыторыю. Аўтар прапануе нам зірнуць на жыццё праз прызму светаўспрымання васьмігадовай дзяўчынкі. Але не будзем спяшацца з высновамі. Хіба мала прыкладаў, калі тое, што, здавалася б, адрасавана менавіта юным чытачам, знаходзіць водгук у дарослых сэрцах? Да таго ж, у гэтыя пераднавагоднія дні, калі ў вясковых хатах і гарадскіх кватэрах сваё пачэснае месца ўжо займаюць і ўпрыгожваюцца ёлкі, калі гарадскія вуліцы і плошчы па вечарах зіхацяць рознакаляровымі гірляндамі, нібы ў сапраўднай казцы, усе мы ў сэрцы пачынаем адчуваць сябе крыху дзецьмі.**

**Алесь БАДАК**



**Валерыя РАДУНЬ (САРОТНІК)**

# ЦУКЕРКІ

**(з пачутага)**



Шчыра кажучы, мала што памятаю з дзяцінства, але гэты выпадак надоўга ўрэзаўся ў памяць.

Наша агульнае «безынтэрнэтнае» дзяцінства, якое выпала на дзевяностыя гады, прайшло ў двары. У кустах шыпшыны ля Светчынага пад'езда ў нас быў «Штаб», жалезная лесвіца ля дарожкі праз двор на аўтобусны прыпынак была «Замкам», а качалка пад бярозамі — месцам глыбокіх разважанняў і вельмі-вельмі сур'ёзных размоў аб тым, з кім можна памяняцца наклейкамі з альбома «Кароль Леў». У астатнім двор быў як двор, толькі што наш доўгі і шматпавярховы дом агінаў яго, бы гара: менавіта гарой здалёк ён мне і здаваўся.

І, вядома, як абавязковы атрыбут кожнага двара — лаўкі, большасць якіх акупіравалі бабулі, у хустках і модных капялюшыках, у старых паліточыках і дарагіх паўфутрах. Адны з іх выгульвалі ўнукаў, іншыя проста выходзілі ў дваровы «свет» абмеркаваць апошнія навіны.

Сярод бабуль асабліва вылучалася баба Клава.

У нашым доме яна пасялілася дзесьці праз месяц пасля таго, як я пайшла ў першы клас, і што цікава, акурат пад намі. Але гэтае суседства нельга было назваць прыемным.

У двор, пасядзець на лаўцы, яна выходзіла без унукаў: казалі, унукі тыя ўжо выраслі і не дужа да яе гарнуліся. І хапіла б аднаго разу паразмаўляць з ёй, каб зразумець чаму. Невысокая і не вельмі поўная, яна, здавалася, ніколі не была нічым задаволеная, нікога і нічога не любіла і магла любому сапсаваць настрой.

Аднойчы баба Клава гэтак давяла да слёз маю сяброўку Светку, якая выгульвала свайго сабаку ля дома. Што ёй не спадабалася ў мікраскапічным шчанюку-шпіцы, я дагэтуль не разумею, але яна злосна гыркнула нешта накшталт: "Развялі сабак, каб вы здохлі ўсе, багацеі". Светка аслупянела, бо кім заўгодна, але багацеямі яе бацькоў назваць было нельга. Шпіц жа, адчуўшы ў гэтых словах небяспеку для маленькай гаспадыні, храбра нацягнуў павадок, з тонкім брэхам тузануўшыся ў бок бабы Клавы. Тая закрычала, што сабака шалёны і што яна напіша ў міліцыю на Светчыных бацькоў заяву, каб яго ўсыпілі...

Яна, між іншым, многа каму пагражала міліцыяй. Наш худы і высокі ўчастковы дзядзька Коля па-філасофску адносіўся да гэтага: «У мяне такіх яшчэ тры ў суседніх дамах... Ды вы супакойцеся, зараз восень, абвастрэнні ў людзей». Што за «абвастрэнні» мы, малыя, не разумелі, а Светку бабуля з маці адпойвалі валяр'янкай пасля гэтага выпадку.

Бабулі на лавачцы ў нашым двары, як і належыць бабулям на лавачках, усё і пра ўсіх заўсёды ведалі. Баба Клава таксама ведала, але толькі дрэннае. Хто п'е. Хто курыць. У каго ў сям'і не ўсё ладзіцца. Астатнія бабулі таксама нібы зараджаліся ад яе і пачыналі абмываць костачкі суседзям.

Але, як вядома, кожнае дзеянне нараджае роўнае па моцы процідзеянне. І час ад часу сярод жыхароў дома ішло нібы нейкае спаборніцтва: хто раздражніць бабу Клаву больш і на каго скаргу яна напіша на гэты раз. Здавалася, канца гэтаму ўжо не будзе ніколі. І тут здарылася нечаканае... 

Неяк я вярнулася дадому пасля школы і з прыхожай пачула, як на кухні размаўляюць тата і мама.

— ...і гэта не абвастрэнне, ведаеш, — чуўся мамін голас. — Яна проста лаецца з усімі. Ты ж ведаеш, мы ваду па начах не ўключаем, ды і ванна ў нас не сталёвая. І Настачка не бегае па доме...

— Я і мяне дастала, што зробіш,— у тон яму гучаў голас таты. — Характар такі. А з участковым я пагавару.

— Мы ўжо пагаварылі, — у маміным голасе пачулася іронія. — Яна збіраецца на яго скаргу пісаць. Вышэй. Таму што ён яе справамі не займаецца. Гэта пасля таго, як Ганна Іванаўна і яшчэ людзі падзякі пісалі, памятаеш, тады? І на пандус гэты скардзіцца абяцала... А што тым жа мамам з каляскамі рабіць? І бабулі з трэцяга паверха, яна ж толькі на калясцы і рухаецца...

— Гэта як з пчоламі і мухамі, — сказаў тата якраз у той момант, калі я зайшла на кухню.

— Якімі? — умяшалася я ў размову.

— Такімі, — хіхікнуў тата, шчоўкаючы лёгенька мяне па носе. — Ёсць людзі як пчолы: усюды бачаць толькі кветкі. Не ведаю, наколькі гэта добра.

— А мухі, сама ведаеш, што ўсюды бачаць, — падхапіла мама і коратка засмяялася.

Я ўспомніла стары туалет у вёсцы і скаланулася.

— Фу-у-у. І што, баба Клава толькі ...толькі гэта і бачыць паўсюль?

— Ну-уу-у, — працягнуў тата.

— Вобразна, — усміхнулася мама. — Еш давай. І ёгуртам не абыдзешся, глядзі ў мяне.

...Я самотна тоўгала лыжку ў супе і думала пра пчол і мух. Што гэта атрымліваецца: мы ўсе ўнутры як мухі... ці як пчолы? І як праверыць? На хвіліну мне нават стала страшна — а што, калі я муха?

Мама тым часам паставіла на стол вазачку з цукеркамі — польскімі «Крунамі», ананаснымі. Я адсунула суп далей і палезла па цукерку.

— Нават не думай,— сказала мама. — Іх есці нельга.

— Чаму-у-у, — заныла я.

— Таму што... — мама задумалася і дадала загадкава: — Вось з'ясі і ператворышся.

— У што?

— У тое, што ты на самай справе ёсць.

— У муху ці пчалу? — з жахам прагаварыла я.

Мама ўсміхнулася.

— Чаму адразу — у пчалу ці муху? Можа, ты... жабка?

Я нахмурылася.

— Мам, а гэта сапраўды чароўныя цукеркі?

— Сапраўды, сапраўды. Паеш — і давай за ўрокі.

Я паглядзела на цукеркі. З аднаго боку, я была ўжо даволі дарослая для такіх «казачак», а з іншага... Што, калі так яно і ёсць? Значыць, калі даць такую цукерку бабе Клаве, можна даведацца, хто яна на самай справе?

Што рабіць далей, уяўляла я дрэнна. Але на той момант гэтая ідэя падалася мне, васьмігадовай, настолькі лагічнай і зразумелай, што заставалася толькі дачакацца заўтрашняга дня і здзейсніць яе.

...

— Ты ўпэўнена, што нам трэба гэта рабіць? — Светка, як заўсёды, сумнявалася.

— Так, упэўнена, — злосна адказала я, бо яна пыталася пра гэта ўжо пяты раз. Мы сядзелі ў «Замку» і абмяркоўвалі мой «план».

— Ну, добра. І як ты гэта зробіш? І слоік табе навошта?

— Не ведаю, — шчыра прызналася я. — А слоік... пабачыш.

Нарэшце баба Клава выйшла з пад'езда (яна заўсёды выходзіла пасядзець на лавачцы ў адзін і той жа час). Трэба было дзейнічаць.

Мы бокам, паціху, гледзячы ў зямлю, пайшлі ёй наперарэз. Але, крыху не разлічыўшы адлегласць, з размаху ўрэзаліся ў яе.

— Ах, каб вас халера! — закрычала баба Клава. — Глядзіце, куды ідзіце!

— Баба Клава, прабачце, калі ласка! — завершчала Светка.

Баба Клава, як кажуць цяпер, «завісла».

— Вазьміце, калі ласка, — я працягнула ёй цукерку. — І прабачце нам. Мы так больш не будзем!

Баба Клава ўзяла цукерку, прабурчала «ну, дзякуй», а мы са Светкай хуценька-хуценька адступілі ў «Штаб», адкуль сталі наглядаць за ёй.

Мы, магчыма, і ўбачылі б «метамарфозу», калі б баба Клава не зыркнула ў бок нашых кустоў: нам давялося адвярнуцца.

— Вось і высветлілася, — сказала я.

— А што цяпер рабіць? — спалохана спытала Светка.

— Лавіць! — і я дастала мой слоік. — Бо з'ядуць.

Дома нікога не было. Мы са Светкай паскідалі красоўкі і накіраваліся ў мой пакой. Слоік паставілі на канапу, а самі бухнуліся на падлогу і прыліплі да яго вачамі. Муха трывожна поўзала ўнутры.

— А цяпер што? Калі яна назад ператворыцца? — спытала Светка.

Але што рабіць далей, я не ведала.

І тут бразнулі ключы ў дзвярах, верагодна, гэта была мама. Мы хуценька прыкрылі слоік з мухай падушкамі і выскачылі ў прыхожую.

— Ма-а-ама! — радасна закрычала я.

— Добры дзень, цётка Іра! — перабіваючы мяне, павіталася Светка.

Мама паставіла сумку на крэсла ў прыхожай і падазрона паглядзела на нас.

— Добры дзень. Света, чай будзеш? — спытала яна.

Я незаўважна ўшчыпнула Светку, і яна піскнула:

— Не! Я ўжо пабегла! Дзякуй, цётка Іра!

— А як мы зразумеем, што яна ўжо ператварылася? — не адчаплялася Светка. — Ёсць якія знакі ці што?

— Не ведаю, не ведаю! — ледзь не закрычала я. — А колькі ўжо прайшло?

— Я не разумею па гадзінніку, — надзьмулася Светка. — Бабуля мне купіла гадзіннік, гаворыць, час вучыцца, а я не ўмею!

Я закаціла вочы і дастала свой гадзіннік, электронны.

— Хвілін дзесяць. Ну што, паглядзім?

Мы са страхам азірнуліся і... нікога не ўбачылі!

Кінуліся да лавачкі. На тым месцы, дзе нядаўна бачылі бабу Клаву, сядзела... муха. Вялікая, тоўстая. Зялёная.

Светка прыдушана піскнула ў мяне за спінай.

Яна шмыганула за дзверы.

Мама накіравалася на кухню, я — следам, а ў галаве круцілася адно пытанне: расказаць ёй усё зараз ці пачакаць?

— Так, а хто смецце не вынес? А талеркі пасля сябе хто не памыў? — незадаволена спытала мама.

Я ўздыхнула: значыць, пачакаць.

Час ляцеў непрыкметна. Пакуль я справілася са сваімі дамашнімі абавязкамі, з працы вярнуўся тата. Ён заняў месца на кухні, а мама пайшла нешта чытаць у гасцёўню. Я накіравалася да слоіка. А там... Муха, а дакладней баба Клава, ляжала на дне слоіка. І нават ножкамі не дрыгала. Мне стала страшна. Трэба было неяк пра ўсё расказаць маме. Трэба было нешта рабіць. Трэба было...

І я пайшла ў гасцёўню, адчуваючы, як халадзеюць рукі і як слёзы пацяку цякуць па шчаках.

— Ма-ам, — я пацягнула маму за рукаў. Яна адклала ўбок свае паперы і здрыганулася: выгляд, думаю, у мяне быў яшчэ той.

— Ма-ам... Я цукерку брала.

— Та-ак?

— І бабе Клаве дала. І яна... яна...

Але больш нічога я сказаць не магла — горкі камяк сціснуў мне горла, і я заплакала цяпер ужо ўголас. Не, баба Клава, вядома, усім надакучыла. Але памерці вось так, мухай, у слоіку...

— Ды што ж здарылася такое? — мама глядзела спалохана.

Як бы ўсё магло быць далей, невядома, але ў гэты момант пазванілі ў дзверы. Мама паглядзела на мяне яшчэ раз і пайшла адчыняць. Я прыціснулася спінай да шафы ў прыхожай, выглянула з-за яе... і аслупянела. Бо на парозе стаяла насупленая баба Клава, жывая і здаровая.

— Тут вось... — буркнула яна. — Сын яблыкі прывёз. А куды мне стольк? Псуюцца.

— Д-дзякуй, — толькі і змагла вымавіць мама.

Баба Клава паківала, развярнулася і пайшла да сябе.

— Што гэта было, — спытаў тата, асцярожна выглядваючы з кухні.

— Баба Клава, — мама не магла адарваць здзіўленага позірку ад пакунка з яблыкамі.

— А іх можна есці? Яны... не атручаныя? — хмыкнуў тата. А потым паглядзеў на мяне.

— А з табой?

Я хуценька выцерла слёзы.

— Нічога, тат. Гэта яблыкі?

— Дык вось пра што ты гаварыла, — усміхнулася мама. — Ты дала ёй цукерку...

— ...а яна яблыкі прынесла, — задуменна прагаварыў тата. — Гэта, часам, не чароўныя цукеркі былі, м?

...

Мы са Светкай потым здагадаліся, што здарылася: баба Клава проста адышла ад лавачкі, а на яе прысела гэтая злашчасная муха. Потым мы доўга смяяліся, але, калі я ўспамінаю той слоік з мёртвай мухай, мне становіцца не да смеху.

А баба Клава, казалі, больш ні на кога не пісала скаргаў. Прынамсі, нам больш ад яе не перападала. Як і Светкінаму шпіцу. Казалі, што яна нават з унукамі памірылася.

А я час ад часу думаю: «Мабыць, гэтыя цукеркі і сапраўды былі чароўныя?..»

# РАСКЛАД НА ЗАЎТРА

## Палітычная сістэма Старога Свету на шляху перамен



**Нядаўнія парламенцкія выбары ў Іспаніі завяршыліся з незвычайным для гэтай краіны вынікам: упершыню за апошнія 38 гадоў ніводная партыя не атрымала большасці месцаў у парламенце. На фоне цяперашняга эканамічнага крызісу кансерватары страцілі амаль палову мандатаў. Яны занялі першае месца толькі з невялікім адрывам ад дзвюх левых партый.**

Адна з іх — Podemos (у перакладзе з іспанскага — «Мы можам») — была створана толькі летась і з тых часоў рухаецца ў Іспаніі ад аднаго поспеху да другога. Галасы новым левым аддалі 22 працэнты выбаршчыкаў, а іх канкурэнтам з сістэмнай «Сацыялістычнай працоўнай партыі» — 20,5. Ліберальны рух Ciudadanos («Грамадзяне»), гэтак жа, як Podemos, з'явіўся на палітычнай сцэне ўсяго некалькі гадоў назад. Па выніках выбараў новыя лібералы атрымалі 15%.

Як заўважаюць аналітыкі, наступствы крызісу (рост беспрацоўя, узмацненне сацыяльнай няроўнасці, адсутнасць стабільнасці) працягваюць паўсюдна змешваць палітычныя карты. Выбаршчыкі стаміліся ад фармальных дуэляў партый, якія сходзяцца па ўсіх галоўных пытаннях. І гатовы падтрымаць штосьці новае.



### «ЧАС СУДОКУ»

Пасля парламенцкіх выбараў у Іспаніі склалася даволі цікавая сітуацыя. Народная партыя, якая знаходзіцца ва ўладзе, набрала больш за сем мільёнаў галасоў і атрымала 123 дэпутацкія мандаты, страціўшы пры гэтым 63 парламенцкія крэслы. Гэта азначае, што да абсалютнай большасці (176 мандатаў) ёй вельмі далёка. Іспанская сацыялістычная працоўная партыя (PSOE) атрымала ўсяго толькі 90 месцаў, што з'яўляецца найгоршым вынікам з 1997 года. Але нават пры гэтым яна застаецца ўплывовым гульцом — у саюзе з кансерватарамі або стварыўшы кааліцыю з рухам Podemos і нацыяналістамі левага напрамку.

Кіраўнік сацыялістаў Педра Санчас прызнаў, што Народная партыя стала пераможцай. «Іспанцы заявілі пра пачатак новага палітычнага этапу. Пачынаецца працэс дыялогу, і PSOE будзе абараняць агульнадзяржаўныя інтарэсы ў гэты перыяд», — заўважыў Санчас. Цяперашні старшыня ўрада Марыяна Рахой акрэсліў сваё права на тое, «каб паспрабаваць сфарміраваць урад, бо за Народную партыю была аддадзена найвялікшая колькасць галасоў». Новы палітычны рух «Грамадзяне» пад началам каталонца Альберта Рыверы, які пазіцыянуе сябе як цэнтрысцкі, атрымаў 40 парламенцкіх месцаў. На іх вельмі разлічвае Народная партыя, але гэтага недастаткова для дасягнення абсалютнай большасці.

«Сёння нарадзілася новая Іспанія», — заявіў лідар Podemos Пабла Іглесіяс па выніках выбараў. Ён выступіў за канстытуцыйную абарону сацыяльных правоў, у прыватнасці права на годнае жыллё, адукацыю і ахову здароўя, а таксама рэфармаванне закона пра выбары. У гэтым пытанні яго пазіцыя супала як з пазіцыяй Рыверы, так і Альберта Гарсона, лідара Аб'яднаных левых (2 месцы) і найбольш маладога (29 гадоў) прэтэндэнта на крэсла старшыні ўрада.

Саюз паміж PSOE і Podemos можа даць абедзвюм сілам 159 дэпутацкіх мандатаў, але гэты паказчык таксама далёкі ад абсалютнай большасці. Каб дасягнуць запаветнага, ім трэба аб'яднацца з левымі нацыяналістамі накшталт Ezquerra (дзевяць месцаў). PSOE не сыходзіцца з Podemos і Esquerra па пытанні тэрытарыяльнай цэласці краіны, асабліва ў тым, што тычыцца самавызначэння Каталоніі.

Парламент, што ўтварыўся ў выніку такіх выбараў, будзе раздробненым. Сума галасоў двух асноўных



гульцоў, што па чарзе змянялі адзін аднаго ва ўладзе — Народнай партыі і PSOE, — толькі крыху перавышае 50%. У 2011 годзе гэты паказчык дасягаў 73%. Цяпер іх заўважна пасунулі левыя і цэнтрысцкія сілы.

Гама варыянтаў даволі шырокая, таму эксперты агучвалі самыя розныя прагнозы: ад прадстаўніка Народнай партыі ў якасці кіраўніка ўрада да блока левых сіл, што ўзначальваецца сацыялістам Санчасам, ці нават скліканне новых выбараў у двухмесячны тэрмін, калі не атрымаецца сфарміраваць стабільны ўрад. Лідараў партый, паўнамоцных прапанаваць кандыдатуры на пост кіраўніка ўрада, павінен запрасіць да сябе на сустрэчу кароль.

У сувязі з мноствам розных камбінацый, пагадненняў і альянсаў паміж партыямі многія назвалі вечар нядзелі (адразу пасля правядзення выбараў) «часам судоку». Але намеснік галоўнага рэдактара газеты Tiempo Алвара Ньета схіляецца да магчымасці тактычнага саюза паміж дзвюма галоўнымі партыямі. «PSOE будзе дэманстраваць стабільнасць. Гэтая партыя не будзе ставіць ніякіх эксперыментаў і збліжацца з левымі і нацыяналістамі. Іх пазіцыі па пытанні Каталоніі занадта адрозніваюцца», — адзначыў эксперт. Ён таксама заўважыў, што Народная партыя захоўвае абсалютную большасць у Сенаце (121 сенатар з 208), што дапамагае трымаць пад кантролем працэс заканатворчасці.

Шэраг экспертаў прагназуюць, што хутчэй за ўсё на чале ўрада застанецца Марыяна Рахой, які складзе саюз з сацыялістамі, працягваючы ігнараваць Podemos. Аднак і пры гэтым раскладзе палітычная сістэма пірэнейскай краіны, што раскалолася па прыкмеце розных пакаленняў, ужо не будзе ранейшай. Паколькі нельга не



зважаць на ўражальны прагрэс новых левых: 8% у 2014 годзе, 15% — сёлета ўвесну, 22% — у снежні.

### ПАДДАНЫЯ ЦІ ГРАМАДЗЯНЕ?

«Пачынаецца новы палітычны этап у нашай краіне. Іспанія прагаласавала за змену сістэмы. Сёння нарадзілася новая Іспанія», — заявіў лідар Podemos Пабла Іглесіяс, выступаючы перад журналістамі ў штаб-кватэры партыі. Ён нагадаў, што гэтыя выбары сталі першымі на нацыянальным узроўні, у якіх узяла ўдзел яго партыя. «Ужо ў першых выбарах мы атрымалі больш за 20%, а самыя лепшыя паказчыкі ў Каталоніі і ў Краіне Баскаў. Сацыялісты паказалі найгоршы вынік у сваёй гісторыі, а Народная партыя — з 1989 года», — заявіў Іглесіяс.




Прыгледзімся больш пільна да іспанскіх трыумфатараў. Podemos афіцыйна стала партыяй у студзені 2014 года. Яна ўтварылася вакол касцяка актывістаў так званага «Руху 15 мая» — іспанскага аналагу Occupy Wall Street. У 2011-м гэты рух узяў удзел у самай масавай грамадзянскай мабілізацыі ў Іспаніі за апошнія гады — дэманстрацыі прайшлі ў дзясятках гарадоў па ўсёй краіне, да іх далучыліся каля васьмі мільёнаў чалавек. Асноўныя мэты партыі — 35-гадзінны працоўны тыдзень, выхад на пенсію ва ўзросце 60 гадоў, скасаванне апошніх ліберальных працоўных і эканамічных рэформаў, адмова ад двухпартыйнай сістэмы і супрацьстаянне ўплыву Германіі і «вялікай тройкі» (Міжнародны валютны фонд, Еўрапейская камісія і Еўрапейскі Цэнтрабанк) у нацыянальнай і еўрапейскай палітыцы.

Лідар «Падэмаса» — 37-гадовы Пабла Мануэль Іглесіяс Турыа — іспанскі пісьменнік, выкладчык паліталогіі ў Мадрыдскім універсітэце Камплутэнсе, тэлевядучы. Летась быў абраны дэпутатам Еўрапейскага парламента. Пабла Іглесіяс атрымаў юрыдычную і паліталагічную адукацыю, у 2008 годзе абараніў доктарскую ступень. Яго дысертацыя прысвечана грамадзянскаму непадпарадкаванню як форме змагання з урадам. Стаў шырока вядомы як левы інтэлектуал дзякуючы рэгулярнаму ўдзелу ў тэледэбатах і публіцыстыцы.

У сваёй калонцы ў адной з самых папулярных іспанскіх газет «Эль Мунда», прысвечанай адрачэнню ад кароны Хуана Карласа І, Іглесіяс пісаў, што абедзве галоўныя партыі — Іспанская сацыялістычная працоўная і Народная — не здольныя кіраваць краінай і страцілі давер іспанцаў, да якіх ставяцца як да «падданых, а не грамадзян». «Адрачэнне Хуана Карласа І — не ізаляваная падзея, а яшчэ адзін сімптом гэтага распаду і няздольнасці нашых інстытуцый знайсці выйсце з эканамічнага, палітычнага і сацыяльнага крызісу», — заўважаў левы палітык. На думку Пабла Іглесіяса, «Падэмас» здольны стварыць новую Іспанію, «дзе роўнасць і воля не былі б пустымі словамі, дзе ўсе мы мелі б права на годнае жыццё і не існавала б гэтулькіх прывілеяў для нешматлікіх».

### КРАТАР НЕ З ТАГО БОКУ

Наступствы крызісу з'яўляюцца галоўнай прычынай змен палітычнага ландшафту Іспаніі, адзначаюць эксперты. Краіна стала адным з еўрапейскіх лідараў па беспрацоўі (22,4% эканамічна актыўнага насельніцтва) і вымушана была падразаць сацыяльныя праграмы. Зразумела, у падобных умовах двухпартыйная сістэма не змагла выстаяць.

**Узмоцненае падаткаабкладанне працоўнай часткі насельніцтва і выдаткі на шматмільённае войска «сацыяльных утрыманцаў» падрываюць перспектывы эканамічнага росту.**

Прычым такое становішча характэрнае не толькі для Іспаніі, а і шэрагу іншых еўрапейскіх дзяржаў. Напрыклад, у Італіі, дзе беспрацоўе таксама вельмі высокае (12,4%), традыцыйны расклад таксама быў парушаны з'яўленнем новых гульцоў. Створаны ў 2009 годзе «Рух пяці зорак» Бепе Грыла пасунуў «старыя» партыі. Узначаленае былым комікам аб'яднанне хоча пераступіць праз раскол на левых і правых, прадстаўляе сябе вектарам удзелу грамадзян у справах дзяржавы. Прыклад Грэцыі паказвае, што дамінантныя партыі могуць беззваротна страціць пазіцыі з-за глыбокага крызісу. Ва ўмовах цяжкай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў краіне (25,2% беспрацоўных) палітычны краявід рэзка змяніўся. Месца Усягрэчаскага сацыялістычнага руху заняла СІРІЗА (35,5% на вераснёўскіх выбарах).

У Францыі з яе масавым беспрацоўем (10,8%) біпалярны падзел на правых і левых таксама пахіснуўся. Як казаў заснавальнік радыкальнай «Партыі левых» Жан Люк Меланшон, «у нашай краіне кратар адкрыўся не з таго боку гары». Эфектыўней за ўсіх народнай незадаволенасцю карыстаюцца ўльтраправыя, якія ўпэўнена набіраюць вагу на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Францыя стала трохпалярнай сістэмай з правымі рэспубліканцамі, левай Сацыялістычнай партыяй і ўльтраправым Нацыянальным фронтам.

Як сцвярджаюць аналітыкі, вынікі снежаньскіх рэгіянальных выбараў у Францыі і парламенцкіх у Іспаніі яскрава дэманструюць распад двухпартыйнай сістэмы, якая дамінавала да апошняга часу ў большасці краін Захаду. Палітычныя эліты Старога Свету сталі за апошняе дзесяцігоддзе «кастай недатыкальных», адбылося іх адчужэнне ад грамадства, цалкам знікла паняцце нацыянальных інтарэсаў. У знешняй палітыцы гэтыя эліты слепа падпарадкоўваюцца дыктату ЗША, ва ўнутранай — навязваюць грамадству ўльтраліберальныя каштоўнасці. Гэты працэс праходзіць на фоне знішчэння сярэдняга класа, непамернага раздзімання сацыяльнай дзяржавы, утрыманне якой паглынае львіную долю ВУП. Узмоцненае падаткаабкладанне працоўнай часткі насельніцтва і выдаткі на шматмільённае войска «сацыяльных утрыманцаў» падрываюць перспектывы эканамічнага росту. Назіральнікі робяць выснову: калі вядучыя палітычныя партыі Еўропы і далей будуць займацца імітацыяй палітыкі, не праводзячы глыбокіх рэформаў, прыход да ўлады як лева- так і праварадыкальных сіл у многіх краінах прадвызначаны.

**Захар БУРАК.**

■ Карысныя прылады

# «ПЯЦЁРКА» ПА ПАВОДЗІНАХ

**Калі раней добрым паводзінам вучылі бацькі і школа, то цяпер частку гэтых функцый можна смела даверыць электроніцы. У гэтым аглядзе мы раскажам пра пяць самых незвычайных сучасных прыстасаванняў, якія дапамагаюць людзям навучыцца добра сябе паводзіць у грамадстве.**

## ТРЭНАЖОР УСМЕШКІ

Японца немагчыма ўявіць без усмешкі. Як бы ні ставіўся да іншага чалавека японец, як дрэнна сябе ні адчуваў бы, ён усё роўна будзе ўсміхацца на ўвесь рот — такая традыцыя. Пры гэтым падобным паводзінам жыхароў Краіны ўзыходзячага сонца вучаць з ранняга дзяцінства.

З развіццём тэхналогій, як высветлілася, стала магчымым навучаць дзяцей правільна ўсміхацца пры дапамозе спецыяльных прылад, такіх як трэнажор Electro Smile. Гэты гаджэт неабходна правільна замацаваць на галаву дзіцяці, а потым актываваць. Прынцып дзеяння Electro Smile заснаваны на стымуляцыі лёгкімі разрадамі электрычнага току асаблівых мімічных мышцаў на твары дзіцяці. Сам



малы пры гэтым не будзе адчуваць ніякага сур'ёзнага дыскамфорту — сіла току пры гэтым мінімальная. Але з часам яго твар навучыцца ўсміхацца лёгка і правільна, так, што ўсе вакол будуць верыць у шчырасць гэтай натрэніраванай усмешкі.

## БРАНЗАЛЕТ СУПРАЦЬ ЛАЯНКІ

Культура размовы — гэта не менш важны элемент поспеху ў грамадстве, чым культура паводзін і ўменне ўсміхацца нават самым непрыемным людзям. Аднак, здавалася б, нават самыя прыстойныя людзі самага высокага сацыяльнага статусу часта ўжываюць у гаворцы нецэнзурныя словы і нічога не могуць з сабой зрабіць пры гэтым.



У такім выпадку ім дапаможа матывацыйны бранзалет, які быў распрацаваны томскімі студэнтамі. Гэты незвычайны аксесуар створаны менавіта для таго, каб адвучыць чалавека мацюкацца і выкарыстоўваць словы-паразіты. І тут усё заснавана на маленькіх электрычных імпульсах з «выхавальным» эфектам. Бранзалет павінен быць злучаны на рэгулярнай аснове са смартфонам чалавека, які носіць яго на руцэ. У самім жа тэлефоне павінна быць ўстаноўлена спецыяльная праграма, якая будзе аналізаваць гаворку карыстальніка і вышукваць у ёй забароненыя словы згодна з загадзя зацверджаным спісам. Як толькі чалавек мацюкнецца або выкарыстае слова-паразіт, бранзалет дасць разрад току. Вядома, сіла гэтага ўдару будзе зусім не вялікая, але дастатковая для таго, каб надалей аб'ект сачыў за сваёй мовай.

## СТУДЭНТА НА КАНТРОЛЬ

Студэнты далёка не заўсёды ўсведамляюць важнасць вучобы і здаровага ладу жыцця для сваёй будучыні. А таму замест лекцыйных аўдыторый і бібліятэк яны праводзяць большую частку часу ў барах і начных клубах, марнуючы час не на занятні, а на забавы.

Вывучыць узаемасувязь здаровага сну, фізічнай актыўнасці, забаў, вучобы і паспяховасці вырашыла група энтузіястаў з Дартмуцкага каледжа, аднаго з самых уплывовых ВНУ ЗША. Распрацаваўшы спецыяльны дадатак для смартфонаў пад кіраваннем мабільнай аперацыйнай сістэмы Android, яны на працягу некалькіх тыдняў збіралі звесткі аб жыцці студэнтаў у сваёй навучальнай установе. Пры дапамозе ўбудаваных у тэлефоны інтэрфейсаў кантролю, напрыклад, акселераметра, модуля GPS, сістэм лагавання апарата і г.д., даследчыкі змаглі стварыць аб'ёмную карціну жыцця сваіх паддоследных, даведацца пра іх лад жыцця, расклад дня, колькасць часу, выдаткаванага на вучобу і на забавы. Затым навукоўцы правялі карэляцыю паміж атрыманымі звесткамі і акадэмічнай паспяховасцю студэнтаў.

У выніку было створана мабільнае прыстасаванне StudentLife, якое будзе вывучаць жыццё ўладальніка тэлефона, а таксама спрабаваць паўплываць на яе ў пазітыўны бок — прымусіць навучэнца больш адводзіць часу вучобе, сну і фізічным нагрузкам, і менш — за-



бавам. Пры гэтым праграма будзе дзейнічаць як пры дапамозе парад, так і сілавым метадам, напрыклад, блакуючы некаторыя праграмы на смартфоне, у тым ліку магчымасць тэлефанаваць і прымаць выклікі.

## ПРАВІЛЬНАЯ МАТЫВАЦЫЯ

Лянота і нежаданне што-небудзь рабіць — гэта таксама дрэнныя паводзіны, якія шкодзяць як самому гультаяватаму чалавеку, так і людзям, якія яго атачаюць. Але бескарысна змагацца з гэтай праблемай, калі ў вас няма правільнай матывацыі, якую немагчыма будзе праігнараваць. Менавіта яе і дае лянівым людзям «разумны» бранзалет з назвай Pavlok.

Pavlok — гэта бранзалет, які навучыць вас кожны дзень здзяйсняць маленькія жыццёвыя подзвігі, рабіць зусім неймаверныя раней рэчы (напрыклад, прачынацца а шостай раніцы, бегаць па пяць кіламетраў, займацца спортам,



творчасцю, адмаўляцца ад шкодных звычак, у тым ліку ад алкаголю і курэння). Здавалася б, Pavlok — гэта ўсяго толькі яшчэ адзін фітнес-трэкер. Так яно і ёсць, калі не браць пад увагу той факт, што гэты «разумны» бранзалет строга карае карыстальніка за нявыкананыя планы на дзень. Так, і тут электраток! Варта толькі чалавеку не прачнуцца па сігнале будзільніка, праігнараваць ранішнюю прабежку або закурыць цыгарэту, як Pavlok ударыць яго токам. Як і ў выпадку з бранзалетам супраць лаянкі ад томскіх студэнтаў, гэты гаджэт дае адносна слабы электрычны разрад, але ён усё роўна непрыемны чалавеку, асабліва калі такое ўздзеянне практыкуецца рэгулярна. Хочаш не хочаш, а пачынаеш слухацца гэтую прыладу: змяняеш жыццё да лепшага, пазбаўляешся ад ляноты.

## ЗАПАЛЬНІЧКА АД... КУРЭННЯ

Нягледзячы на сусветную тэндэнцыю па забароне курэння ў грамадскіх месцах, яна актыўна распаўсюджваецца ў апошнія гады і з кожным днём становіцца ўсё больш жорсткай, на планеце пакуль існуюць сотні мільёнаў актыўных курцоў, якія штодня вы-



курваюць пачак цыгарэт, а то і два, і якія атручваюць прастору вакол сябе з'едлівым, небяспечным дымам.

Справіцца з курэннем можна толькі тады, калі сам курэц па-сапраўднаму захоча пазбавіцца ад гэтай звычкі. Прылада Quitbit можа быць запраграмаваная пры дапамозе прыстасавання ў смартфоне на колькасць спрацоўванняў у дзень або прамежкі паміж спрацоўваннямі. Гэта дазволіць заўзятым курцам кантраляваць колькасць выкураных цыгарэт, бо многія людзі з гэтай шкоднай звычкай звычайна нават не задумваюцца, калі цягнуцца па новую порцыю нікаціну. А з запальнічкай, якая можа і не спрацаваць, кантраляваць сябе становіцца лягчэй.

■ Дайджэст

## СЯДЗІШ У СЕТЦЫ — БУДЗЕШ НЯШЧАСНЫМ

**Чарговае пацверджанне таго, што сацыяльныя сеткі не толькі марнуюць шмат часу рэальнага жыцця, але і негатыўна ўплываюць на светаўспрыманне і самаадчуванне людзей, знайшлі навукоўцы з дацкага Інстытута даследавання шчасця. Даследчыкам удалося ўгаварыць групу суайчыннікаў не карыстацца папулярнай сацыяльнай сеткай Facebook «цэлы» тыдзень — і высветлілася, што датчане, якія ігнаруюць сацсеткі, прыкметна шчаслівейшыя за іншых жыхароў каралеўства.**



Даследчыкі, у прыватнасці, высветлілі, што датчане, якія зусім не карысталіся названай сацыяльнай сеткай на працягу тыдня, былі задаволены жыццём на 8,12 бала з 10. «Паддоследныя» адчувалі сябе значна менш раздражнёнымі і самотнымі, чым падчас актыўных віртуальных зносін. Людзі, якія адмовіліся ад наведвання сацсеткі, адзначалі таксама павелічэнне долі сацыяльных кантактаў у рэальным свеце, адчувалі сябе менш злымі і самотнымі.

Паводле слоў дырэктара Інстытута вывучэння шчасця Мейка Вікінга, вынікі эксперымента шмат у чым абумоўлены імкненнем людзей параўноўваць сябе з іншымі. У віртуальным свеце падобнае параўнанне можа ўвесці чалавека ў зман, паколькі 61% удзельнікаў эксперымента пераважна пакідаюць такія статусы, каб паказаць сябе з «добрага боку», а 69% удзельнікаў стараюцца выкладваць фотаздымкі «важных рэчаў» са свайго жыцця.

«Facebook скажае наша ўспрыманне рэальнасці і тое, як у рэчаіснасці жывуць іншыя людзі. Заходзячы на старонку ў сацсетцы, мы ўвесь час параўноўваем сябе з іншымі людзьмі, а паколькі большасць людзей пераважна выкладвае на сваіх старонках толькі пазітыў, гэта дае нам вельмі зменлівае ўспрыманне рэальнасці», — падкрэслівае Вікінг.

«З прычыны таго, што людзі ў Facebook найчасцей распавядаюць пра тое, як яны праводзяць выхадныя, а не шэрыя будні, а таксама пішуць пра дасягненні сваіх дзяцей, а не пра іх капрызы, даволі хутка ў чытачоў ствараецца ілжывае адчуванне свету, напоўненага толькі светлымі фарбамі», — адзначаюць дацкія СМІ. Нягледзячы на вынікі даследавання, Вікінг перакананы, што іх веданне не прымусіць большасць людзей адмовіцца ад сацсетак, бо «людзі ўпарта працягваюць займацца рэчамі, якія не робяць іх шчаслівейшымі». Паводле слоў дырэктара Інстытута вывучэння шчасця, навукоўцы дзесяцігоддзямі спрабуюць зразумець, чаму людзям уласцівы негатыўныя паводзіны.

## ТАЯМНІЧАЯ ФОРМА ЖЫЦЦЯ ЗАСЯЛЯЕ АКІЯНЫ

**Амерыканскія навукоўцы пасля цэлага шэрагу даследаванняў зрабілі сенсацыйную заяву пра жыццё ў акіянах. Як высветлілася, найбуйнейшыя вадаёмы на Зямлі імкліва засяляюць нявывучаныя формы жыцця.**

Група навукоўцаў з Універсітэта Джона Хопкінса прааналізавала павелічэнне ў сусветным акіяне какалітафарыдаў, якія ўяўляюць сабой аднаклетачныя планктонныя водарасці. «Гэтых таямнічых жывых арганізмаў за апошнія гады становіцца ўсё больш, а прычына таму — павышэнне ўзроўню вуглякіслага газу ў акіянах», — паведамляе Business Insider.



Як паказаў аналіз, у 1965 годзе доля гэтых водарасцяў у экасістэмах акіянаў складала ўсяго 2%, а да 2010 года ўзрасла да 20%. Навукоўцы ніяк не чакалі такога імклівага развіцця падзей. «Вельмі хуткімі тэмпамі адбываецца нешта дзіўнае. Па нашых разліках, гэтая форма жыцця прадоўжыць распаўсюджвацца з фантастычнай хуткасцю», — адзначаюць навукоўцы. Яшчэ большую трывогу ў спецыялістаў выклікае той факт, што какалітафарыды да канца не вывучаны. Па словах амерыканскіх навукоўцаў, гэтыя мікраарганізмы сёння развіліся да такой ступені, што маюць вапнавы шкілет. Нягледзячы на шматлікія даследаванні, эксперты так і не ведаюць, што ўяўляюць з сябе какалітафарыды і што ад іх чакаць у будучыні.

## СМЕРЦЬ — ЗАМАРОЗКА — УВАСКРАШЭННЕ?

**Спецыялісты кампаніі Humai заявілі, што распрацоўваюць тэхналогію ажыўлення людзей. Амерыканская кампанія мае намер вяртаць памерлых да жыцця, выкарыстоўваючы штучны інтэлект.**



Прадстаўнікі фірмы расказалі, што мозг чалавека, які жадае ажыць, будзе замарожаны, пасля чаго ў яго ўвядуць спецыяльны чып. Як толькі тэхналогіі дазволяць, замёрзлы мозг дастануць з крыякамеры і змесцяць у новае штучнае цела, вярнуўшы такім чынам чалавека да жыцця.

Перад смерцю «пацыента» будуць вывучаць з дапамогай штучнага інтэлекту: яго гутарковы стыль, паводзіны, разумовыя працэсы, звычкі. Атрыманыя звесткі будуць закадзіраваныя ў чыпе і інтэграваныя з мозгам памерлага чалавека і спецыяльным штучным целам.

Заснавальнік кампаніі Humai Джош Боканегра паведаміў у інтэрв'ю Popular Science, што кампанія мае намер збіраць як мага больш шырокую інфармацыю аб сваіх «пацыентах» да самай іх смерці з дапамогай адмысловага лічбавага прыстасавання, якое знаходзіцца цяпер у стадыі распрацоўкі. Калі тэхналогія будзе цалкам распрацавана, навукоўцы пачнуць імплантаваць мозг у штучныя целы.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.**
*hvir@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества (в комплексе) в составе:**

| № | Наименование | Инв. № | Общ. пл., кв.м |
|---|---|---|---|
| 1 | Здание инженерно-бытового корпуса, инв. №98318 | 640/С-84380 | 10378,5 |
| 2 | Тепловые сети, инв. №98342 | 640/С-84368 | - |
| 3 | Площадка асфальтобетонная (инв. №98364) | 640/С-84443 | 1612,5 |
| 4 | Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. №98365) | 640/С-84378 | 783,6 |
| 5 | Трансформаторная подстанция | 640/С-84444 | 37,7 |
| 6 | Сети водопровода (инв. №98340, инв. №98339, инв. №98341) | 640/С-84373 | - |
| 7 | Канализационная насосная станция (инв. №98330) | 640/С-84377 | 25,2 |
| 8 | Эстакада – площадка для мойки автомобилей | 640/С-84445 | - |
| 9 | Топливно-заправочный пункт (инв. №98327) | 640/С-84371 | - |
| 10 | Очистные сооружения дождевых стоков (инв. №98331) | 640/С-84365 | - |
| 11 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. №25301) | 640/С-84372 | - |
| 12 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. №25300) | 640/С-84367 | - |
| 13 | Контрольно-пропускной пункт | 640/С-84440 | 8,1 |
| 14 | Склад газовых баллонов | 640/С-84442 | 107,8 |
| 15 | Вспомогательный корпус часть, инв. №98358 | 640/С-84381 | 1353,6 |
| 16 | Объекты благоустройства | 640/С-84370 | - |
| 17 | Главный корпус, инв. №98319 | 640/С-84382 | 22590,0 |
| 18 | Здание вспомогательного корпуса, инв. №98360 | 640/С-51701 | 335,7 |
| 19 | Склад тяжелых металлов | 640/С-39784 | 634,6 |
| 20 | Здание склада | 640/С-38241 | 535,9 |
| 21 | Производственное здание-котельная, инв. №98361 | 640/С-51700 | 194,3 |
| 22 | Гараж со вспомогательным корпусом | 640/С-47756 | 1362,3 |
| 23 | Здание склада | 640/С-38242 | 2467,1 |
| 24 | Здание информационно-вычислительного центра | 640/С-38243 | 2393,6 |
| 25 | Автомонтажный корпус | 640/С-39783 | 8785,1 |
| 26 | Дренажная насосная станция (инв. №98329) | 640/С-84375 | 330,6 |
| 27 | Сети канализации (инв. №98626) | 640/С-84379 | - |
| 28 | **Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона)** | | |

Указанные объекты расположены на земельном участке площадью **8,4478 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101. Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га. Имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

**Начальная цена снижена на 65% и составляет без НДС – 22 837 816 400 бел. руб. Задаток 5% от начальной цены (1 141 890 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 30.09.2015.*

Аукцион состоится **21.01.2016** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.01.2016** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкий пивоваренный завод» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом имущества:**

**здание административного корпуса, общ. пл. 2168.9 кв.м (инв. № 640/С-27293); весовая, общ. пл. 25.8 кв.м (инв. № 640/С-27303); переходная галерея, общ. пл. 65 кв.м (инв. № 640/С-27304); элеватор, общ. пл. 1414.3 кв.м (инв. № 640/С-27309); главный производственный корпус, общ. пл. 12370 кв.м (инв. № 640/С-27312); проходная, общ. пл. 30.8 кв.м (инв. № 640/С-27313); незавершенное законсервированное капитальное строение, общ. пл. 440.2 кв.м (инв. № 640/U-72996); оборудование элеватора** на земельном участке площадью **3.1450 га** по адресу: г. Слуцк, ул. Тутаринова, 1;

**трансформаторная подстанция, общ. пл. 40,2 кв.м (инв. № 640/С-27297); насосная станция (станция 2 подъема), общ. пл. 116.9 кв.м (инв. № 640/С-51797)**. на земельном участке площадью **0,1960 га** по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко;

**скважина № 8** (инв. № 640/С-27298) и **ограждение**.

**Начальная цена без НДС – 7 244 348 480 бел. руб.** ***(стоимость снижена на 60%)*****. Задаток 10% от начальной цены (724 434 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

*Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 12.12.2015.*

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **19.01.2016 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.01.2016 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## И З В Е Щ Е Н И Е

**Государственное производственное объединение**

**«Минскстрой»**

**доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектные декларации о строительстве объекта «Жилой дом № 1 по генплану в квартале улиц Горецкого, Шаранговича, лесопарк «Медвежино»** в г. Минске, *опубликованные в газете «Звязда» 31 января 2015 года и 6 февраля 2015 года:*

Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию – 31 января 2016 г.

*Генеральный директор* *Н.В.Милошевский*

УНП 101099370

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **Открытое акционерное общество «Трест Белтрансстрой», 220050, г. Минск, ул. Советская, 8** |
| **Лот № 1:** | СКЛАД СУХИХ ЛЕСОМАТЕРИАЛОВ, общей площадью 501,7 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47323, **г. Брест, ул. Карасева, 100. Начальная цена лота с НДС 20% – 338 201 490 бел. руб. (снижена на 80%)** |
| **Лот № 2:** | РАСТВОРНЫЙ УЗЕЛ, общей площадью 498,7 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47330, **г. Брест, ул. Карасева, 100. Начальная цена лота с НДС 20% – 421 152 420 бел. руб. (снижена на 80%)** |
| **Лот № 3:** | МЕХАНИЧЕСКИЙ СКЛАД ЦЕМЕНТА, общей площадью 45,2 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47322, **г. Брест, ул. Карасева, 100. Начальная цена лота с НДС 20% – 38 941 170 бел. руб. (снижена на 80%)** |
| **Лот № 4:** | ЗДАНИЕ КОМПРЕССОРНОЙ СТАНЦИИ, общей площадью 62,4 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47332, **г. Брест, ул. Карасева, 100. Начальная цена лота с НДС 20% – 69 624 130 бел. руб. (снижена на 80%)** |
| **Лот № 5:** | ПАРОВАЯ ЛЕСОСУШИЛКА, общей площадью 71,5 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47325, **г. Брест, ул. Карасева, 100/6. Начальная цена лота с НДС 20% – 431 082 190 бел. руб. (снижена на 20%)** |
| **Лот № 6:** | ПРИСТРОЙКА К ПИЛОРАМЕ, общей площадью 348,3 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47328, **г. Брест, ул. Карасева, 100/5. Начальная цена лота с НДС 20% – 1 076 083 350 бел. руб. (снижена на 20%)** |

**Сведения о земельном участке и сроках подписания договора купли-продажи**: Лоты №№ 1–6, расположены на земельном участке пл. **2,3253 га,** предоставленным продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производственной базы. Продавец, в зависимости от количества реализованных лотов, в установленном законодательством порядке после проведения аукциона обращается за осуществлением регистрационных действий в отношении земельных участков, необходимых для обслуживания предметов аукциона. После выделения самостоятельного земельного участка для обслуживания реализованного лота (лотов), между продавцом и покупателем в течение 5 (пяти) рабочих дней после получения продавцом свидетельства о государственной регистрации земельного участка, должен быть подписан договор купли-продажи

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Оплата за предмет аукциона (лот) производится в порядке, установленном в договоре купли-продажи

**Порядок проведения аукциона,** оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **12.01.2016 в 11.15 по адресу: г. Минск, ул. Советская, 8, ОАО «Трест Белтрансстрой»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **11.01.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71; auction@cpo.by; www.cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Пинагрузсервис», г. Пинск, ул. Рокоссовского, д. 2** |

**Предмет аукциона**

**Объекты недвижимости по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Рокоссовского**

| | Наименование | Назначение | Общая площадь, кв.м | Инвентарный номер | № дома |
|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | Центр-выставка | Складское помещение | 131,5 | 130/D-56448 | 23Ж-1 |
| | **Начальная цена с НДС 20% – 608 101 200 бел. руб.** | | | | |
| **Лот № 2** | Магазин со складом | Складское помещение | 137,1 | 130/D-56449 | 23Ж-2 |
| | **Начальная цена с НДС 20% – 580 646 400 бел. руб.** | | | | |
| **Лот № 3** | Офис с выставочным залом | Складское помещение | 314,6 | 130/D-56450 | 23Ж-3 |
| | **Начальная цена с НДС 20% – 921 764 400 бел. руб.** | | | | |
| **Лот № 4** | Автодром | Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства | 4515 площадь асфальтобетонной площадки | 130/С-40558 | 2Б |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности** | асфальтобетонная площадка, ограждение железобетонное, ограждение из металлической сетки, металлические ворота, бетонная эстакада |

**Сведения о земельном участке**: площадь (га) **0.4866**. Категория: земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов. Целевое назначение: для обслуживания автодрома. Вид права: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20% – 1 605 492 000 белорусских рублей**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона (Лота) в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона (Лот) по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.** Лоты №№ 1–3 обременены договорами аренды. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **01.02.2016 в 14.00 по адресу: г. Пинск, ул. Рокоссовского, д. 2, ОАО «Пинагрузсервис»,** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **29.01.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

**3 февраля 2016 г.** **№2-А/2016**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ в г. ГОМЕЛЕ

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды (лет) | Начальная стоимость, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку докум-ции, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | район индивидуальной жилой застрой Романовичи (участок № 568 по генплану) | 340100000008002395 | 0,0986 | для строительства и обслуживаня одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | охранная зона линий связи и радиофикации | 99 | 50 409 447 | 2 520 000 | 14 792 369 |
| 2 | район индивидуальной жилой застрой Романовичи (участок № 569 по генплану) | 340100000008002997 | 0,1068 | | охранная зона линий связи и радиофикации | 99 | 54 601 714 | 2 730 000 | 15 742 707 |
| 3 | ул. Юбилейная, 8а | 340100000002003927 | 0,0033 | для размещения легкотипного торгового павильона | ограничений в использовании нет | 5 | 5 919 313 | 300 000 | 16 496 564 |
| 4 | ул. Дворникова (район жилого дома №12) | 340100000003003088 | 0,0009 | для размещения легкотипного киоска для розничной торговли или бытового обслуживания населения | охранная зона линий связи и радиофикации | 5 | 1 237 542 | 62 000 | 21 587 194 |
| 5 | ул. Борисенко (в районе строймаркета KSK и станции технического обслуживания) | 340100000006005238 | 2,4298 | для строительства и обслуживания торгового центра и производственно-складских сооружений | охранная зона линий электропередачи, сетей и сооружений канализации и водоснабжения | 5 | 2 839 619 800 | 141 981 000 | 46 492 867 |

1. **Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).**

2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфроструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. №2-14)

